№№45–46
(2565–2566)

22 сакавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

ДАСЛОЎНА



"Няма Еўропы без Беларусі, гэта адзіны кантынент. У вас (беларусаў) няма выбару. Вы мусіце скіраваць сваю краіну на шлях, па якім пайшлі свет і Еўропа. Гэта станецца, а калі вы хочаце, каб гэта наступіла раней, то трэба працаваць больш і разумней. І тады перамога гарантаваная. І вось гэтага я вам жадаю".

Былы прэзідэнт Польшчы Лех Валенса ў інтэрв'ю "Польскаму радыё".

...І была надзея

Год таму ў Беларусі гэтымі днямі было ўсё па-іншаму. Быў дваццаціградусны мароз, паўсюдна ляжаў снег, а на Кастрычніцкай плошчы кіпелі жарсці. 20 сакавіка 2006 года ў цэнтры Мінска з'явіўся намётавы гарадок... І была надзея.

І тады, і зараз шмат хто задаваўся пытаннем, чаму так адбылося, што моладзь самастойна, без усялякіх узгадненняў з палітычнымі лідэрамі, рашылася на пратэст, хаця напярэдадні, 19 сакавіка, гэтыя самыя лідэры заклікалі ўсіх разыходзіцца па дамах. Вось як адказвае на гэта пытанне адзін з арганізатараў намётавага гарадка **Вячаслаў СІЧЫК**.

— Калі кандыдаты заяўляюць, што пойдуць да канца, я ім ужо проста не веру. Падчас тых падзей і пасля тых падзей лідэры апазіцыі заяўлялі, што людзей на плошчы ім для нечага не хапіла. Дык вось, я заяўляю з усёй адказнасцю: калі б на Кастрычніцкую плошчу прыйшлі 300 тысяч чалавек, яны б усё роўна не ведалі, што рабіць. Таму што колькасць залежыць ад якасці. А якасць якраз залежыць ад тых людзей, якія з'яўляюцца лідэрамі апазіцыі.

Дзяніс РУДКОЎСКІ.

Гарачы тыдзень салідарнасці

У 60 гарадах Еўропы, Злучаных Штатаў Амерыкі і Канады праходзяць акцыі пад лозунгам "Дайце голас народу Беларусі".

Маладзёжныя актывісты ў ноч на 19 сакавіка заклеілі рты помнікам у Бостане (ЗША), Атаве (Канада), Бардо, Нансі, Парыжы, Страсбургу, Ліёне (Францыя), Берліне, Хемніцы, Фрайбургу, Ене (Германія), Вільнюсе (Літва), Стакгольме, Лундзе, Гётэборгу, Мальме (Швецыя), Эдынбургу, Ёрку, Лідсе, Нотынгеме (Вялікабрытанія), Бруселі, Левене (Бельгія), Лісабоне, Порта, Матасінхасе (Партугалія), Рызе (Латвія), Бухарэсце (Румынія), Любляне (Славенія), Орхусе, Капенгагене, Одэнсе, Альборгу (Данія), Берне (Швейцарыя), Хельсінкі, Улу (Фінляндыя), Вагенінгене (Нідэрланды), Дубліне (Ірландыя), Падгорыцы (Чарнагорыя), Заграбе (Харватыя), Прышціне (Косава), Нісе (Сербія), Сафіі, Варне (Балгарыя), Фларэнцыі, Рыме (Італія), Камаціні (Грэцыя), Варшаве, Вроцлаве, Познані, Горжуве, Гданьску, Беластоку, Кракаве (Польшча), Мадрыдзе, Барселоне (Іспанія), Кіеве, Львове (Украіна), Празе (Чэхія), Борасе, Сковдзе (Швецыя) і іншых гарадах.

Пра гэта прэс-цэнтру Хартыі'97 паведамілі ў брусельскім офісе маладзёжнай арганізацыі JEF (Jeunesse Europeene Federaliste/Маладыя Еўрапейскія Федэралісты), якая з'яўляецца арганізатарам акцыі. Акцыя была праведзена ў знак салідарнасці з беларусамі, якія змагаюцца за свабоду, і ў рамках "тыдня салідарнасці з Беларуссю", якая працягнецца да 25 сакавіка.

"Еўрасаюз павінен выкарыстаць свой міжнародны ўплыў і патрабаваць ажыццяўлення прынцыпаў дэмакратыі, свабоды слова і правоў чалавека на ўсёй тэрыторыі Еўропы. Урад Аляксандра Лукашэнкі ў Беларусі абмяжоўвае свабоду прэсы, тэлебачанне знаходзіцца пад кантролем дзяржавы, і ў грамадзян няма магчымасці браць удзел у палітычнай дзейнасці", — гаворыцца ў заяве арганізацыі.

На гэтым тыдні акцыі салідарнасці з беларускімі дэмакратамі праходзяць па ўсёй Еўропе, а таксама ў ЗША. У Вашынгтоне 25 сакавіка адбудзецца дэманстрацыя ў падтрымку беларускіх зняволеных па палітычных матывах. А завяршальным мерапрыемствам "гарачага тыдня салідарнасці" стане 25 сакавіка канцэрт "Салідарныя з Беларуссю" ў Варшаве, які пройдзе на Замкавай плошчы польскай сталіцы.

ПАЛІТКУХНЯ

Афіцыйныя асобы нават не ўспомнілі пра Расію

Як вядома, завяршальнымі акордамі візіту кіраўніка рабочай групы па Беларусі Парламенцкай асамблеі АБСЕ немкі Уты Цапф стаў шэраг сустрэч з апазіцыйнымі палітыкамі, грамадскімі дзеячамі, навукоўцамі, праваабаронцамі.

"Гэта толькі пачатак дыялогу, і мы яшчэ павінны ўбачыць, ці сапраўды ён атрымоўваецца. Мы не можам быць перакананыя, але мы спадзяёмся на працяг дыялогу. Мы дамовіліся працягнуць семінары, падобныя на той, што прайшоў. Але я ўпэўненая, што наступным разам гэта мерапрыемства будзе больш маштабным, чым тое, што адбылося ўчора", — падсумавала вынікі візіту Ута Цапф.

Гаворка ідзе пра семінар "Вывучэнне магчымасцяў для Беларусі ў рамках Еўрапейскай палітыкі добрасуседства", які прайшоў 15 сакавіка ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі пад старшынствам Уты Цапф і віцэ-спікера Сяргея Забалотца. Гэты семінар адкладваўся доўгія тры гады, таму ягонае правядзенне і можна фармальна ацэньваць як пэўны зрух. Але пра які дыялог і з кім можа ісці гаворка пасля аднаго-адзінага семінара?

На гэтае пытанне мы папрасілі адказаць аднаго з удзельнікаў мерапрыемства, былога старшыню Савета Рэспублікі **Аляксандра ВАЙТОВІЧА.**

— Семінар быў арганізаваны Парламенцкай асамблеяй АБСЕ сумесна з беларускай дэлегацыяй у ПА АБСЕ на чале з віцэ-спікерам Сяргеем Забалотцам. Беларускае прадстаўніцтва забяспечылі пераважна дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі (Сяргей Забалоцец, Анатоль Красуцкі, Наталля Андрэйчык, Міхаіл Арда, Леанід Глухоўскі, Вадзім Папоў, Анатоль Малафееў, Юрый Кулакоўскі, Іван Семяненя, Вольга Абрамава...). Пайменны спіс удзельнікаў набывае надзвычайную важнасць пры адказе на пытанне, хто з кім вядзе дыялог.

Адна з секцый мерапрыемства называлася "Еўрапейская палітыка добрасуседства: канцэпцыя добрасуседства на рэгіянальным і субрэгіянальным узроўнях. Погляды краін-суседзяў". Таму арганізатары мерапрыемства з беларускага боку запрасілі дэпутата з Украіны, аднаго дэпутата з Латвіі, двух — з Польшчы. Аляксандр Вайтовіч дзівіцца з таго факта, што на семінары не было ніводнага расіяніна.

"Самае дзіўнае, што нікога не запрасілі з Расіі; ці то запрашалі, аднак ніхто не прыехаў, але расіян не было. Але ж калі гаворка ідзе пра палітыку добрасуседства на міжрэгіянальным узроўні, то такога супрацоўніцтва, больш чым з рэгіёнамі Расіі, Беларусь не мае ні з адной еўрапейскай краінай. На гэтую акалічнасць звярталі ўвагу ўдзельнікі семінара, запрошаныя Утай Цапф, у той час як прадстаўнікі афіцыйнага Мінска маўчалі. Пыталіся таксама, чаму няма ўкраінскіх дэпутатаў і Таццяна Процька, і я, і іншыя палітыкі. Афіцыйныя асобы маўчалі. І ў мяне ўзнікла думка: ці не было гэта зроблена наўмысна, каб паказаць: мы цяпер пражывём і без вас, мы пойдзем на Захад", — дзеліцца сваімі ўражаннямі Аляксандр Вайтовіч.

Разглядаліся на форуме і тыя 12 умоў, якія Еўрапейскі Саюз вылучыў да афіцыйнага Мінска. Але разглядаліся ў своеасаблівым ракурсе.

"Усе выступоўцы з боку Еўропы падкрэслівалі, што 12 умоў — гэта аснова паляпшэння адносін з Беларуссю, якая павінна зрабіць крок насустрач. Еўропа лічыць, што мячык — на беларускім баку. Што б ні гаварылі ў гэтым кантэксце дэпутаты, для мяне зразумела, што Нацыянальны сход — не самастойная галіна ўлады. Але яны не гаварылі наогул нічога! Не адрэагавалі ні на адну з 12 прапаноў Еўропы", — з жалем канстатаваў палітык.

Зайшла гаворка пра справядлівыя, дэмакратычныя выбары. *"Лукашэнка прызнаў, што выбары парламенцкія сфальсіфікавалі. Ну куды далей ехаць? Для Нацыянальнага сходу гэтага павінна быць дастаткова, каб дапрацаваць Выбарчы кодэкс такім чынам, каб не заставалася ніякіх лазеек. (Ці распачаць працэдуру імпічменту? — **Рэд.**). Што вы думаеце: выступае дэпутат, і пра што ж ён гаворыць? А гаворыць ён не пра нашы выбары, пра парушэнні заканадаўства, а як дрэнна праходзяць выбары ў Амерыцы",* — расказвае А.Вайтовіч.

— Ну што вам, беларусы, яшчэ прапанаваць?

На семінары згадваліся і зніклыя палітыкі: віцэ-спікер Віктар Ганчар, бізнесмен Анатоль Красуцкі, былы міністр унутраных спраў Юрый Захаранка, тэлеаператар Дзмітрый Завадскі. Але дэпутаты ў сваім стылі казалі пра *"надуманасць"* праблемы. *"Дзе ў Еўропе ёсць яшчэ краіна, дзе б прапалі віцэ-прэм'ер і міністр унутраных спраў? Няма ніводнай краіны! А дзяржава не можа знайсці сіл і сродкаў* (ці скажам адкрыта — не хоча. — **Аўт.**), каб расследаваць гэтыя знікненні і знайсці вінаватых! Гэта — не надуманая праблема, гэта праблема Беларусі", — кажа А.Вайтовіч.

Дык ці варта гаварыць пра пачатак нейкага дыялогу? Дыялогу каго з кім і наконт чаго?

Аляксандр Вайтовіч кажа, што крок насустрач зрабіць трэба.

"Я лічу, што грамадскасць краіны павінна была выкарыстаць гэты семінар для таго, каб пачаць дыялог з нейкімі ўладнымі структурамі. Перш-наперш такая структура — Нацыянальны сход. А затым менавіта рэакцыя Нацыянальнага сходу нам і пакажа, наколькі прадстаўнікі ўлады гатовы ісці на гэты дыялог", — лічыць А.Вайтовіч.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ТЫМ ЧАСАМ

Міхаіл Марыніч адмовіўся ад удзелу ў семінары

"Я вельмі расчараваны тым, што арганізатары семінара — Парламенцкая асамблея АБСЕ — ужылі дыскрымінацыйны прынцып да прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі. Ніводзін апазіцыянер у спісы выступоўцаў не патрапіў. Што гэта за пазіцыя паважаных міжнародных арганізацый? З якой мэтай нас туды запрашалі? Паказаць "карцінку" па тэлебачанні, што ў семінары бяруць удзел і дэмакратычныя сілы? Мы не можам згадзіцца з такой пазіцыяй, і таму я адмовіўся ўдзельнічаць у семінары Уты Цапф. Мы можам удзельнічаць у такіх мерапрыемствах толькі як раўнапраўныя суб'екты, на роўных умовах. Калі ўлада працягвае трымаць у турмах палітычных зняволеных: Аляксандра Казуліна, Дзмітрыя Дашкевіча, Міколу Статкевіча, Паўла Севярынца і іншых нашых сяброў, калі маладзёжных актывістаў пераследуюць за іх грамадзянскую пазіцыю, калі напярэдадні візіту Уты Цапф затрымліваюць лідэраў апазіцыйных партый, — нельга ўдзельнічаць у такіх сумнеўных мерапрыемствах. Як былы палітвязень я вельмі добра ведаю, наколькі патрэбная сёння ўсім, хто ў турмах, наша салідарнасць і прынцыповасць", — заявіў Міхаіл Марыніч.

Аляксандр Мілінкевіч не разумее Уту Цапф

Калі не гаварыць пра рэпрэсіі супраць актывістаў грамадскіх арганізацый і партый, дык дыялог паміж Беларуссю і Еўрасаюзам нават шкодны. Такое меркаванне выказаў адзін з лідэраў дэмакратычных сіл Беларусі Аляксандр Мілінкевіч, каменціруючы сваю сустрэчу з кіраўніком рабочай групы Парламенцкай асамблеі АБСЕ па Беларусі Утай Цапф.

"Еўрапейцам, калі яны пачынаюць працэс дыялогу, вельмі важна памятаць аб тым, што сёння ў нас ідуць жорсткія рэпрэсіі супраць незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт", супраць грамадскіх актывістаў", — сказаў А.Мілінкевіч.

Паводле яго слоў, У.Цапф выказала думку, што дыялог паміж Беларуссю і ЕС можна пачынаць без выканання Беларуссю нейкіх умоў. *"Я лічу, што гэта немагчыма,* — падкрэсліў А.Мілінкевіч. — *Павінны быць выкананы хаця б некаторыя ўмовы. Напрыклад, спыненне палітычных рэпрэсій і вызваленне палітычных зняволеных".*

А.Мілінкевіч таксама адзначыў, што беларуская апазіцыя і Еўропа гатовы да дыялогу. *"Але ўлада да дыялогу яшчэ не гатова,* — сказаў А.Мілінкевіч. — *Улада яшчэ не адчувае небяспекі ў эканоміцы, не адчувае небяспекі ў сваім міжнародным становішчы".* З аднаго боку, падкрэсліў А.Мілінкевіч, беларускія ўлады хацелі б супрацоўніцтва з ЕС, таму што гэта дазволіць вырашыць эканамічныя і сацыяльныя праблемы. *"Улада пагуляе ў дыялог для атрымання эканамічных дывідэндаў, як гуляла з Расіяй у сяброўства і аб'яднанне",* — лічыць А.Мілінкевіч.

ПАЛІТКУХНЯ

Як Мілінкевіч перамог большасцю галасоў і апынуўся ў меншасці

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы разводзяцца. Нягледзячы на тое, што дамовіцца не ўдалося, Кангрэс дэмакратычных сіл пройдзе 21—22 красавіка, і толькі надзвычайныя абставіны могуць перашкодзіць правядзенню форума. Такія вынікі ўнутрыапазіцыйных разборак мінулага тыдня.

Палітсавет Аб'яднаных дэмакратычных сіл, які прайшоў напрыканцы мінулага тыдня, магчыма, быў апошнім. Абмяркоўвалі два праекты далейшых дзеянняў апазіцыі: праект **Аляксандра МІЛІНКЕВІЧА** і праект лідэра Партыі камуністаў Беларускай **Сяргея КАЛЯКІНА.** Абодва ўяўляюць сабой дапрацаваныя дакументы "Кампрамісу дзеля адзінства", прапанаванага старшынёй Партыі БНФ **Вінцуком ВЯЧОРКАМ.** Прынцыповае адрозненне паміж імі — дата правядзення Кангрэса дэмакратычных сіл. У А.Мілінкевіча даты няма (на ягоную думку, з датай трэба вызначацца пасля выпрацоўкі адзінай думкі наконт складу дэлегатаў Кангрэса і парадку дня форума), Сяргей Калякін называе канкрэтныя тэрміны — 21—22 красавіка.

У выніку галасавання прайшоў праект Аляксандра Мілінкевіча: "за" прагаласавалі восем чалавек, "супраць" — чатыры, адзін устрымаўся, а старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка галасаваў за абодва праекты.

Першапачаткова вынікі галасавання наглядальнікі палічылі перамогай Мілінкевіча. Напэўна, забыўшыся, што супраць галасавалі найбольш сур'ёзныя палітычныя ігракі. Нават намеснік старшыні Партыі БНФ Юрый Хадыка ўказаў калегам, што неабходна як мага хутчэй праводзіць Кангрэс, бо дэмакратычныя сілы ўжо страчваюць свае пазіцыі не толькі ўнутры краіны, але і за мяжой.

У выніку, пераспаўшы ноч, прыхільнікі правядзення Кангрэса сабраліся зноў і пастанавілі: Кангрэс дэмакратычных сіл пройдзе 21—22 красавіка, як і прапаноўваў стваравемы Саюз левых партый (Партыя камуністаў Беларуская, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада), Партыя жанчын "Надзея"). "Другога рашэння не будзе. Толькі форс-мажорныя абставіны могуць адмяніць правядзенне Кангрэса", — заявіў па выніках гэтага пасяджэння старшыня аргкамітэта па яго падрыхтоўцы і правядзенні **Аляксандр БУХВОСТАЎ.**

На думку Бухвостава, сітуацыя, калі пяць суб'ектаў Палітсавета блакіруюць прыняцце рашэнняў, прывяла апазіцыю ў тупік. *"Хутчэй за ўсё ў цяперашнім выглядзе Палітсавет збірацца ўжо не будзе,* — гаворыць Бухвостаў, — *а каардынуючую ролю ў АДС будзе выконваць аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні Кангрэса".*

Калі пераводзіць з дыпламатычнай мовы, аб'яднаныя дэмакратычныя сілы раскалоліся на два лагеры: прыхільнікаў Аляксандра Мілінкевіча (сам Аляксандр Мілінкевіч, ягоны паплечнік Віктар Карняенка, аргкамітэты па стварэнні БСДП (Народная Грамада) Міколы Статкевіча, Партыі свабоды і прагрэсу Уладзіміра Навасяда, незарэгістраваная арганізацыя "Малады Фронт" і БСДГ Станіслава Шушкевіча), якія колькасна могуць блакіраваць прыняцце рашэнняў, але якасна не ідуць ні ў якое параўнанне з другой часткай дэмакратычнага лагера. Бо па другі бок спрэчкі — апазіцыйныя партыі (АГП, ПКБ, Партыя БНФ, Партыя жанчын "Надзея", усе групоўкі прадпрымальнікаў).

"Палітсавет — гэта не толькі Мілінкевіч, Карняенка, шэраг невялікіх палітычных суб'ектаў. Цяпер, калі меншасць блакіруе прыняцце любых рашэнняў, паўстала пытанне пра неабходнасць рэфармаваць Палітсавет, што і будзе зроблена на Кангрэсе", — кажа Аляксандр Бухвостаў.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

«Нам патрэбны не асабістыя лаўры, а адна агульная перамога»

Напярэдадні гадавіны прэзідэнцкіх выбараў экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін праз свайго адваката звярнуўся з калоніі да калегі па перадвыбарнай гонцы Аляксандра Мілінкевіча.

"Паважаны Аляксандр Уладзіміравіч, мы з вамі разам прайшлі жорсткі і цяжкі шлях. На нас ляжыць вялікая адказнасць перад гісторыяй і народам. Я заклікаю вас узняцца над цяперашнімі амбіцыямі, быць вышэй за асабістыя інтарэсы і працягнуць руку сваім саратнікам па барацьбе", — цытуе зварот сайт палітыка.

Казулін па-ранейшаму настойвае на правядзенні Кангрэса дэмакратычных сіл у красавіку. На яго думку *"Кангрэс у больш познія тэрміны проста страціць значэнне". "Неправядзенне Кангрэса ў гэтыя тэрміны я расцэньваю як здраду не толькі мне, але і маладым людзям з намётавага гарадка, і ўсім, хто змагаўся, не думаючы пра сябе 19—25 сакавіка 2006 года",* — адзначае Казулін.

Пры гэтым палітык прапаноўвае адным з пунктаў парадку дня Кангрэса зрабіць пытанне аб стварэнні ўрада народнага даверу. Аляксандр Казулін лічыць, што ўзначаліць урад можа Аляксандр Мілінкевіч.

"Вясна 2007 года сапраўды павінна стаць "гарачай", а таксама прадэманстраваць адзінства ўсіх дэмакратычных сіл. Нам патрэбны не асабістыя лаўры, а адна агульная перамога", — лічыць Аляксандр Казулін.

25 сакавіка спаўняецца год, як доктар навук, прафесар, экс-кандыдат у прэзідэнты быў арыштаваны.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 САКАВІКА 2007 г.

ЗАКУЛИСЬЕ

Галина Журавкова выходит из тени

Муж, сын и деверь экс-управляющей делами президента Галины Журавковой уже давно на свободе

А сама Галина Анисимовна была замечена на похоронах экс-министра здравоохранения **Людмилы Постоялко.**

Напомним, что после того, как А.Лукашенко помиловал Журавкову, она таинственным образом исчезла и долгое время о себе никак не заявляла.

Стали поговаривать, что Галина Анисимовна укатила на постоянное место жительства в Украину. Другие утверждали, что она обосновалась в Москве.

Однако в конце минушего года — накануне Нового года — журналисты неожиданно встретили Журавкову в столичном торговом комплексе "Паркинг" — она примеряла сапожки. А почти две недели назад Галина Анисимовна появилась на церемонии прощания с Постоялко. Экс-управляющая делами президента немного пообщалась и даже пообнималась с некоторыми представителями власти и быстренько отбыла в неизвестном направлении.

Вид у бывшей подсудимой был вполне цветущий.

Кстати, как сообщил "Народной воле" начальник отдела по расследованию преступлений Департамента финансовых расследований Комитета Госконтроля **Дмитрий Адамович**, муж Галины Анисимовны **Владимир Журавков**, сын **Виталий Пахомов** и родной брат мужа **Олег Журавков** уже отбыли наказание и вышли на свободу.

По словам Дмитрия Леонидовича, **Виталий Пахомов** освобожден досрочно в конце июня 2005 года. В этом же году освободился и его отчим **Владимир**. А родной брат Владимира Журавкова **Олег** вышел на свободу в мае 2006 года.

Где сейчас живет и чем занимается Галина Журавкова точно не известно.

Адвокат, который представлял интересы Журавковой в суде, говорит, что в последний раз общался с бывшей подзащитной около года назад.

Родная племянница Журавковой, которая работает в республиканской больнице Управления делами президента ("лечкомиссии"), не хочет давать никакой информации о своей тете.

"Нам столько всего пришлось вынести, что я на эту тему предпочитаю вообще не говорить, — сказала в телефонной беседе журналисту "Народной воли" племянница Галины Анисимовны. — *Искренне желаю, чтобы с вашими близкими такого никогда не случалось... Мы пережили этот период, и все..."*

Люди, приближенные к семье одного из бывших подчиненных Журавковой — экс-начальника управления внешнеэкономических связей Управления делами президента **Юрия Матусевича** (он также был осужден вместе с Журавковой, но уже вышел на свободу), говорят, что Галина Анисимовна живет и работает в Москве, а в Минске и в Могилеве бывает лишь наездами.

Кстати, эту информацию подтверждают и некоторые родственники Галины Анисимовны. Да и сразу после суда Журавкова сообщила своим знакомым, что на некоторое время уедет в Россию...

Марина КОКТЫШ.

ДОСЬЕ

Галину Журавкову *признали виновной в завладении имуществом в особо крупном размере с использованием служебных полномочий (речь шла не об одном миллионе долларов). Суд приговорил ее к 4 годам годам лишения свободы с конфискацией имущества и отбыванием наказания в колонии общего режима. Однако в колонию она так и не приехала — Лукашенко помиловал ее. (Это доярку можно упрятать в тюрьму за мешок украденного комбикорма. —* **Ред.***)*

Журавковой запрещено занимать руководящие должности в течение 5 лет.

Сына экс-управляющей делами президента ***Виталия Пахомова*** *приговорили к трем годам лишения свободы с конфискацией имущества и лишением права занимать руководящие должности. Суд признал его виновным в незаконной предпринимательской деятельности, в уклонении от уплаты налогов, повлекшем причинение ущерба в особо крупном размере, в причинении имущественного ущерба без признаков хищения, в подстрекательстве к злоупотреблению властью или служебным положением. Однако свою вину Пахомов не признал. Во время следствия он отказывался давать показания и несколько раз даже обращался с жалобами к Виктору Шейману, сообщая о существовании заговора в отношении семьи Журавковых.*

Мужа президентского "завхоза" — ***Владимира Журавкова*** *признали виновным в уклонении от уплаты налогов путем уклонения от подачи декларации о доходах и имуществе, повлекшим причинение ущерба в особо крупном размере. В.Журавков получил наказание в виде ограничения свободы сроком на два года с конфискацией части имущества.*

Олег Журавков *получил наказание в виде трех лет лишения свободы за уклонение от уплаты налогов.*

АФІЦЫЙНА

Чакайце надбавак

Насельніцтву Беларусі ў першым квартале гэтага года будзе выплачана 20 мільярдаў рублёў у якасці надбавак за сельгаспрадукцыю, што закупляецца на ўласных падворках. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета міністраў №286.

Як лічаць ва ўрадзе, устанаўленне такіх надбавак павысіць матэрыяльную зацікаўленасць уладальнікаў уласных падворкаў у павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі і будзе стымуляваць на далейшае развіццё падсобных гаспадарак.

На малако, што закупляецца на ўласных падворках, устаноўлена надбаўка ў памеры 70 рублёў за кілаграм, за маладняк буйной рагатай жывёлы жывой вагой 100 кг і менш — 1000 рублёў за кілаграм, бульбу, якую насельніцтва здае для прамысловай перапрацоўкі, — 150 рублёў за кілаграм.

Надбаўкі на закупленую ў насельніцтва прадукцыю абавязаны выплачваць тыя нарыхтоўчыя арганізацыі, якія займаюцца закупкай сыравіны, — сельскія гаспадаркі, прадпрыемствы спажыўкааперацыі і прамысловыя арганізацыі.

Марына НОСАВА.

ДЗІКУНСТВА!

Поўны маразм

з боку тых, хто абвінавачвае лідэра Партыі БНФ ***Вінцука ВЯЧОРКУ****, у тым, што ён "брудна лаяўся пры малой дачцэ", а апазіцыйнага актывіста* ***Вячаслава СІЎЧЫКА*** *у тым, што ён "спраўляў малую патрэбу на двары ля праспекта Незалежнасці"*

Суд над Вячаславам Сіўчыкам і Вінцуком Вячоркам адбудзецца 23 сакавіка. Акурат напярэдадні Дня волі. Маглі судзіць і 14 сакавіка, аднак на наступны дзень прадстаўнікі ўлады сустракаліся з кіраўніком рабочай групы парламенцкай асамблеі АБСЕ Утай Цапф. Было няёмка...

І Вячаслава Сіўчыка, і Вінцука Вячорку затрымалі ўвечары 13 сакавіка. Да апошняга часу не было вядома не толькі тое, у чым іх абвінавачваюць, аднак і дзе яны знаходзяцца. Інфармацыю не давалі нават адвакатам. У нашай дэмакратычнай і прававой дзяржаве, што на семінары стараліся ўбіць у галаву спадарыні Цапф дзяржаўныя чыноўнікі, аказваецца, можна ігнараваць жаданні родных пачуць адказ на пытанне, дзе іх блізкія, з лёгкасцю можна без аніякага закона пасадзіць чалавека за краты.

"Затрымалі мяне ўвечары ля ліфта на дзевятым паверсе, калі я з малой дачкой ішоў дахаты, — расказаў карэспандэнту "Народнай волі" **Вінцук ВЯЧОРКА**. — *А пільнаваць пачалі яшчэ ля сядзібы партыі, адкуль я з'ехаў з малой на машыне. Сын, дарэчы, таксама заўважыў, што ля кватэры на лесвіцы сядзелі і палілі разам з дзяўчатамі нейкія маладыя людзі, якія потым мяне і "павязалі". Пасля гэтага адвезлі на Акрэсціна ў прыёмнік-размеркавальнік і выставілі абвінавачванні, што я, маўляў, нецэнзурна лаяўся на міліцыянтаў у публічным месцы на Кальцова, 16 (гэта адрас майго дома) і на іх заўвагі спыніць процідраўную дзейнасць не рэагаваў. На Акрэсціна ж я знаходзіўся ў стане поўнай невядомасці, гэта быў трывожны для мяне дзень, таму што я абсалютна не ўяўляў, што адбываецца вакол. Але каля шасці гадзін вечара мяне нечакана выклікалі з камеры, пасля чаго паведамілі, што суддзёй прынята рашэнне — у сувязі з хібамі ў пратаколе (маўляў, не пазначана, ці прыцягваўся я раней да адміністрацыйнай адказнасці) — выпусціць на свабоду і прызначыць суд на 23 сакавіка. Натуральна, што ўсё гэта робіцца дзеля таго, каб нейтралізаваць мяне ды і іншых на Дзень волі. Цікава, што якраз у дзень затрымання я тэлефанаваў у Мінгарвыканкам і прасіў аб сустрэчы з Паўлавым і дазволе прысутнічаць на сесіі гарвыканкама, дзе будзе разглядацца наша заяўка".*

А вось як затрымлівалі Вячаслава СІЎЧЫКА:

"Гэта адбылося ў 21.30 на плошчы Якуба Коласа, — кажа ён. — *Да мяне падышлі з розных бакоў тры чалавекі, адзін з іх паказаў пасведчанне супрацоўніка міліцыі, пасля чаго мне паведамілі, што патрэбна праехаць у РУУС Савецкага раёна, бо было рабаўніцтва і трэба, каб пацярпелы апазнаў альбо не апазнаў мяне. Паабяцалі, што, калі ўсё будзе нармальна, праз 15 хвілін адпусцяць. Дарэчы, якраз у гэты момант мне патэлефанавала мама і ўсё гэта чула. У аддзяленні мяне даставілі спачатку ў дзяжурную частку, затым адправілі ў актавую залу, дзе ўжо сядзелі нейкія людзі ў цывільным. Там я правёў гадзіну ці дзве, пасля чаго два капітаны адвезлі мяне на Акрэсціна і змясцілі ў пакой для допытаў. Толькі пасля апоўначы, у рэшце рэшт, былі напісаны рапарты і пачалі складаць пратакол. Калі я яго пабачыў, то жахнуўся — аказваецца, я на двары ля праспекта Незалежнасці спраўляў малую патрэбу. Вы ўяўляеце, у які бруд заганяе наша ўлада міліцыю? Якую брудную справу яны вымушаны рабіць?! Пасля гэтага мяне закінулі ў камеру, а напрыканцы наступнага дня выклікалі і сказалі, што я свабодны да 23 сакавіка, калі і адбудзецца суд".*

***

Капец! З боку ўлад — **поўны маразм**! Вы можаце ўявіць, каб Вінцук Вячорка, інтэлігент, можна сказаць, у пятым пакаленні, вядомы навуковец, палітык, наогул спакойны памяркоўны чалавек, узорны сем'янін, мог "брудна лаяцца пры малой дачцэ"? А тое, што прыпісваюць Вячаславу Сіўчыку — наогул клініка. Няўжо ў праваахоўных органах такое ўбоства мазгоў?

На гэты раз сапраўды цікава, як павядзе суд. Але аб гэтым — у наступным нумары.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЧУЛІ?

Грамадскасць патрабуе адстаўкі Аляксандра Радзькова

Віцебская абласная рада грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" (ТБМ) прыняла заяву, у якой, у прыватнасці, утрымліваецца патрабаванне адстаўкі міністра адукацыі Беларусі Аляксандра Радзькова. Пра гэта БелаПАН паведаміў старшыня абласной арганізацыі ТБМ Іосіф Навумчык.

"У апошнія два гады Міністэрства адукацыі мэтанакіравана выціскае беларускую мову і беларускую літаратуру з вучэбнага і выхаваўчага працэсу, — сказаў І.Навумчык. — *Як стала вядома са СМІ, Міністэрства адукацыі, а таксама Саюз пісьменнікаў Беларусі вырашаюць пазбавіць навучэнцаў магчымасці ў дастатковай ступені знаёміцца з творчасцю народных пісьменнікаў і паэтаў Янкі Купалы, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, такіх вядомых беларускіх літаратараў, як Генадзь Бураўкін, Святлана Алексіевіч, Вольга Іпатава, Сяргей Законнікаў, Уладзімір Някляеў, Уладзімір Арлоў, Вітаўт Чаропка, Міхась Скобла і іншых".*

Як ён патлумачыў, у сувязі з гэтым абласная арганізацыя ТБМ вырашыла выказаць свой пратэст, прыняўшы адпаведную заяву.

"Віцебская абласная рада грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" абурана такімі дзікунскімі дзеяннямі Міністэрства адукацыі і Саюза пісьменнікаў Беларусі ў адносінах да набыткаў беларускай літаратуры і яе знакамітых творцаў. Мы патрабуем спыніць шалёны наступ на беларускую мову, беларускую літаратуру. Мы выказваем недавер кіраўніцтву Міністэрства адукацыі Беларусі і патрабуем адстаўкі міністра Аляксандра Радзькова. Заклікаем беларускую грамадскасць і арганізацыі ТБМ падтрымаць нашу заяву", — гаворыцца ў дакументе.

Акрамя таго, абласная арганізацыя ТБМ настойвае *"вярнуць у сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны курс "Беларусазнаўства"; аднавіць выкладанне гісторыі і геаграфіі Беларусі на беларускай мове ў школах з рускай мовай навучання; вярнуць у адукацыйныя стандарты для ўсіх ВНУ абавязковае выкладанне курса "Беларуская мова: прафесійная лексіка"; адмяніць забарону на афіцыйныя сустрэчы з пісьменнікамі, членамі Саюза беларускіх пісьменнікаў ва ўстановах культуры і адукацыі".*

Паводле слоў І.Навумчыка, тэкст заявы накіраваны ў Міністэрства адукацыі, Савет міністраў, Адміністрацыю прэзідэнта Беларусі, ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі", а таксама ў сродкі масавай інфармацыі.

Таццяна ЧАБАТАРОВА.

Чым жа кормяць нашых дзяцей?

Больш як у 70% дашкольных устаноў Брэсцкай вобласці выяўлены парушэнні ў арганізацыі харчавання дзяцей. Пра гэта паведаміў кіраўнік інфармацыйна-аналітычнай групы Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці Віталь Колас.

За невыкананне патрабаванняў санітарных правілаў адхілены ад працы шэсць работнікаў харчовых блокаў. Прыпынена эксплуатацыя сховішча для гародніны ў школе-садку №2 Брэста, дзіцячых садках №№2 і 3 Ляхавічаў. Вынесены пастановы аб закрыцці дзіцячага садка ў вёсцы Зарэчка Драгічынскага раёна і ясляў-садка ў вёсцы Вулька-1 Лунінецкага раёна. Разглядаецца пытанне аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці 35 службовых і адказных асоб.

Ларыса ШЫГАНАВА.

Віза ў Англію падаражэла

Амбасада Вялікабрытаніі ў Беларусі з 1 красавіка павялічвае консульскія зборы за візы ў Злучанае Каралеўства. Пра гэта афіцыйна паведаміла дыпламатычнае прадстаўніцтва краіны ў Мінску.

У прыватнасці, кароткатэрміновая віза (да 6 месяцаў) будзе каштаваць 126 долараў. Дзецям, пацярпелым ад наступстваў чарнобыльскай аварыі, як і раней, візы будуць выдавацца бясплатна. У амбасадзе растлумачылі, што "памер консульскіх збораў вызначаецца парламентам і ў роўнай ступені ўжываецца ва ўсім свеце".

"Узровень консульскіх збораў адлюстроўвае кошт забеспячэння эфектыўнай службы па абароне Злучанага Каралеўства ад нелегальнай працоўнай сілы, арганізаванай злачыннасці, экстрэмізму і тэрарызму, а таксама забеспячэнні лепшага абслугоўвання добрасумленных наведвальнікаў і эмігрантаў.

Па словах дыпламатаў, 90% брытанскіх віз выдаецца на працягу 24 гадзін.

Ул.інф.

НЕЛЬЗЯ МОЛЧАТЬ!

Фальшивые профсоюзы

В январе 2007 года районный суд города Жлобин рассматривал гражданский иск ветерана труда Белорусского металлургического завода Анатолия Ивановича Степаненко к администрации РУП "БМЗ" и профкому БРСРП на этом предприятии. Сам факт такого иска к руководству крупнейшего белорусского предприятия и профсоюзному комитету большой профсоюзной организации заслуживает интереса и внимания. Что такое случилось на "современном" и очень доходном предприятии, что ветеран труда, имеющий 42 года непрерывного стажа в черной металлургии, отработавший сначала 20 лет на Советский Союз, затем 22 года на Республику Беларусь, подал гражданский иск в суд на руководство этого "суперпредприятия"?

Повод для такого иска оказался самый обыкновенный, но очень важный для многих работников этого "флагмана" белорусской промышленности. Трудовая пенсия работника черной металлургии Республики Беларусь составляет весьма скромный размер, в данном случае — это 370.000 рублей. Именно такую пенсию установило "народное государство" за 42 года непрерывного стажа в черной металлургии, за 22 года работы машинистом разливочного крана на РУП "БМЗ" и за 25 лет горячего стажа по Списку №1.

Понимая несуразность пенсионной уравниловки с размером трудового вклада конкретного работника, законодатель разрешил предприятию из своей прибыли доплачивать пенсионерам некоторые суммы к этой убогой пенсии. Доплачивать из той прибыли, которую создавали и создают своим трудом работники этого предприятия. Независимо от их членства в профсоюзе.

После отправки ветерана труда на заслуженную трудовую пенсию по достижении 60-летнего возраста, администрация предприятия в лице генерального директора РУП "БМЗ" Н.Андрианова и председателя профкома А.Коледы... лишили его ежемесячной доплаты к весьма скромной трудовой пенсии. Лишили этой добавки за то, что кадровый рабочий, ветеран черной металлургии, добросовестный и нормальный работник не состоял... в профсоюзе. Хотя Трудовой Кодекс Республики Беларусь запрещает деление работников на *"членов"* или *"нечленов"*, именно эти люди подписали дискриминационный коллективный договор, чтобы лишить доплаты пенсионера. Люди, Вы только вдумайтесь. Директор металлургического завода — депутат областного Совета и председатель профкома — депутат районного Совета выдали ветерану *"почетную"* грамоту за многолетний и добросовестный труд, дали удостоверение ветерана труда РУП "БМЗ" и... плюнули ему вслед. Решили отомстить рабочему за его самостоятельность, за чувство собственного достоинства и самоуважения.

Выталкивая кадрового рабочего на полунищенское доживание и забирая заслуженную, заработанную честным трудом доплату, эти *"депутаты"* показали свое настоящее лицо, свои истинные цели и намерения. А когда они шагали за депутатскими мандатами, то божились защищать *"малообеспеченных и социально уязвимых"*. Особенно цинично в этом деле выглядит т.н. *"профсоюз"* работников промышленности на РУП "БМЗ". Ведь по Уставу эта организация должна защищать и отстаивать интересы трудящихся.

Но есть в этой непристойной и неприглядной истории еще один, очень важный и очень серьезный момент.

Так называемый *профсоюз* работников промышленности на РУП "БМЗ", выступая от имени всего трудового коллектива Белорусского металлургического завода, представляет очень сомнительные и недостоверные бумаги в попытке подтвердить свои полномочия.

На одном из заседаний Жлобинского районного суда представитель профкома некто А.Ваал представил недостоверную копию протокола заседания цехкома ЭСПЦ-1. Приведенный в суд председатель цехкома электросталеплавильного цеха №1 некто В.Несмачный признал факт фальсификации протокола, подтвердил незаконное изменение результатов голосования. Фактически В.Несмачный был уличен в совершении правонарушения. Но суд не счел нужным дать юридическую оценку этого события.

Получив такую поддержку, сторона профкома предъявила суду еще более несуразные бумаги. Принесли копии протоколов, где, не стесняясь, вопреки требованиям Устава, *"принимали"* в профсоюз списками, по 48, по 45 человек разом.

Очередным действием т.н. *профкома* было представление в суде копии *"протокола"* заседания цехкома ЭСПЦ-2 от 15 апреля 2000 года. Списком *"приняли"* в профсоюз работников промышленности сразу 90 человек. Протокол подписал А.Ваал.

Все бы ничего, только *"председатель"* цехового комитета ЭСПЦ-2 некто А.Ваал был принят на работу на РУП "БМЗ" 21 ноября 2002 года. А профсоюз работников промышленности Республики Беларусь был создан 28 мая 2003 года.

Оцените, как совершенно свободно посторонние люди, не работая на Белорусском металлургическом заводе, и не будучи в составе профсоюзной организации, проводят заседания, подписывают *"протоколы"* цехового комитета. Подписывают *"протоколы"* несуществующего на то время профсоюза работников промышленности.

Где еще Вы такое видели?

Такие открытые и явные нарушения законодательства Республики Беларусь этот так называемый *профсоюз* совершает постоянно и очень давно.

В 1999 году я обратился в администрацию РУП "БМЗ" с письмом о нарушениях профсоюзом металлистов Устава профсоюзной организации и законодательства при приеме работников завода в профсоюз. Я обратил особое внимание на незаконное удержание денег под видом профсоюзных взносов. Деньги отнимали у тех, кого вообще не принимали в организацию. Профсоюзный комитет во главе с В.Малашенко и администрация БМЗ признали факты нарушения Устава организации и обещали их устранить.

20 марта 2000 года председатель Республиканского комитета профсоюза металлистов И.Колесник письменно подтвердил факты нарушений Устава профсоюза и случаи незаконного изъятия денег у посторонних людей. При этом гр-н Колесник стыдливо промолчал, сколько денег незаконно отняли и кому их вернули. Все эти безобразия был вынужден подтвердить председатель областного объединения профсоюзов А.Кабанец в письме от 4 июля 2000 г. прокурору Гомельской области О.Половинко. И опять гр-н А.Кабанец из *"скромности"* умолчал, сколько незаконно отняли денег под видом *"взносов"* и сколько кому вернули?

Гомельская прокуратура также из *"скромности"* не стала интересоваться судьбой украденных денег.

12 марта 2003 года генеральный директор РУП "БМЗ" Н.Андрианов письменно снова подтвердил факты неисполнения Устава профсоюза в этой организации. Снова не принимали работников завода в профсоюз, снова незаконно отнимали у них деньги и снова промолчали о том, сколько и кому вернули. В очередной раз денежки уплыли и опять молчат *"правоохранители"*.

23 октября 2003 года заместитель председателя РК БПСРП, Л.Хованский в очередной раз подтвердил, что *"нарушения, указанные т. Степаненко А.И., имели место"*. И снова гр-н Хованский из привычной *"стеснительности"* (?) промолчал, сколько незаконно отняли денег и сколько все-таки денег вернули. А точнее, не вернули ни копейки, как обычно.

А потом произошла совсем дикая вещь.

Министерство юстиции Республики Беларусь 5 марта 2004 года сообщило, *"что, действительно, после реорганизации выборы руководящих органов указанной первичной организации НЕ ПРОВОДИЛИСЬ"*. Мало того, что работников РУП "БМЗ" не принимали в члены профсоюза, что у них совершенно незаконно отнимали деньги. Оказывается, на эти, незаконно отнятые или просто украденные деньги припеваючи жировали и *"кіравалі"* никем не избранные профсоюзные *"начальники"*. Люди, Вы только вдумайтесь, задайте себе вопрос: почему такое возможно на крупнейшем государственном предприятии Беларуси?

А может быть так и должно быть? Может быть, соблюдение и выполнение законов обязательно только для *"подданных"*, для *"черни"*, а наши "начальники", даже если они самозванцы, выше закона? Закон на них не распространяется?

Уважаемый министр юстиции Республики Беларусь гражданин Виктор Григорьевич Голованов! Скажите, пожалуйста, каким образом никем не избранные люди оказались во главе общественной организации на крупнейшем государственном предприятии? По какому праву эти люди заседали вместе с администрацией Белорусского металлургического завода, принимали какие-то решения, подписывали какие-то бумаги?

По их указке расчетно-кассовый центр филиала "Приорбанка" отнимал у посторонних людей деньги под видом *членских взносов* и передавал эти деньги никем не избранным людям. Скажите, почему такое было возможно в нашем, самом *"правовом"* и самом *"народном"*, государстве?

И такая синекура, а поблатному лафа, существовала с 11 июля 2003 года по 28 января 2005 года. Затем, в январе, в обстановке закрытости и почти секретности *"провели"* отчетно-выборную конференцию.

И снова вопрос: каким образом, на каком основании никем не избранные люди проводили *"отчетно-выборную"* конференцию? О чем они могли отчитываться перед работниками Белорусского металлургического завода? О том, как самовольно назначили себя на теплые местечки? Как проедали и транжирили чужие, ворованные деньги?

А кто утверждал отчет фактических самозванцев? На этой *"конференции"* присутствовали разнообразные профсоюзные начальники. О чем они думали, и думали ли они вообще?

Молчит юстиция, молчат *"правоохранители"*, молчит администрация Белорусского металлургического завода. А хищения продолжаются. Капитан милиции О.Скачеляс установил *"факт хищения денежных средств с лицевого счета в Приорбанке у работника РУП "БМЗ" Борейко А.К."*, когда в феврале 2006 года тот обнаружил изъятие денег со своего счета без его согласия или разрешения.

Капитан милиции факт хищения денег установил, но возбуждать уголовное дело по факту хищения отказался. В этом с ним согласился начальник Жлобинского РОВД.

И хищения продолжаются.

Но теперь *"профсоюзные"* деятели чувствуют себя совершенно спокойно и свободно. Им разрешили безбедно жить за счет запуганных и придавленных крепостническим контрактом работников. Власть дозволила своим подручным кормиться за счет подданных. А люди молчат, никто не решается требовать возврата украденных денег.

Все боятся потерять работу, ведь по *декрету* любой может быть уволен без всякого объяснения, может быть выброшен за черту выживания. Аморальный террор и остервенелое беззаконие выбивают из людей остатки человеческого достоинства. Так эта *"власть"* и эти *"защитники"* творят свое черное дело.

После всего рассказанного возникает законный вопрос: а существует ли вообще так называемый *профсоюз работников промышленности* Республики Беларусь? Все эти областные и республиканские *"комитеты"* и *"президиумы"*, *"замы"* и *"председатели"*, чем они занимаются, кроме получения жалования?

Неужели никто их них не задумался о том, что они нарушают Закон, что они унижают и оскорбляют людей, за чей счет они живут? Неужели они не понимают, что незаконно отнятые, фактически украденные деньги превратились в "сребреники"?

Можно все время обманывать немногих. Можно некоторое время обманывать всех. Невозможно все время обманывать всех.

Все равно за обман придется отвечать.

Анатолий Иванович СТЕПАНЕНКО, ветеран труда Белорусского металлургического завода.

г. Жлобин.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 САКАВІКА 2007 г.

ПАЗІЦЫЯ

Не трэба ўсе бочкі каціць на Мілінкевіча

Добры дзень, “Народная воля”!

Так атрымалася, што сёлета ў цэнтры ўвагі незалежных СМІ, у тым ліку і “Народнай волі”, апынуўся Аляксандр Мілінкевіч. Хто яго падтрымлівае, хто папракае.

Я асабіста не знаёмы з экскандыдатам у прэзідэнты, але я наведваў мітынгі, дзе ён выступаў, быў на Кангрэсе дэмсіл 1—2 кастрычніка 2005 года, слухаў уважліва яго прамову.

Многім ён мне падабаецца, але ёсць і адна прэтэнзія. 25 сакавіка мінулага года на мітынгу ў скверы Янкі Купалы ён сказаў: “Мы завалім нашу краіну праўдзівай інфармацыяй”. І завалілі. Нічога не атрымалася. І не магло атрымацца. Беларуская ўлада, каб умацаваць свае пазіцыі, ідзе на самыя жорсткія крокі. А.Лукашэнка і яго памагатыя прадугледзелі ўсе памылкі царскага і савецкага рэжымаў, нямецкай акупацыі, Садама Хусейна, Слабадана Мілошавіча. Усё схоплена, усё “пад каўпаком у Мюлера”...

Шмат хто абвінавачвае Аляксандра Мілінкевіча ў тым, што пасля сакавіцкіх падзей 2006 года нічога значнага не зроблена. Я з гэтым катэгарычна не згодны. Якраз Мілінкевіч пасля 19 сакавіка шмат што зрабіў. Ён не паўтарыў памылку Ганчарыка, не апусціў рукі, не зышоў з палітычнай арэны. Ён шмат разоў наведваў краіны дэмакратычнай Еўропы, дзе яго прымалі на самым высокім узроўні. Ён прадставіў там інфармацыю аб падзеях у Беларусі, аб масавых парушэннях правоў чалавека, аб адсутнасці дэмакратычных рэформ. Ён займаўся ўладкаваннем на вучобу ў еўрапейскія краіны беларускіх студэнтаў, адлічаных з ВНУ пасля сакавіцкіх падзей, уладкаваннем на працу за мяжой тых нашых грамадзян, якія звольнены з работы ў сваёй краіне па палітычных матывах.

У артыкуле “Слова аб Кангрэсе” (“Народная воля” ад 1.03.07 г.) Анатоль Лябедзька безапеляцыйна заяўляе, што папярэдняе пагадненне дэмсіл скончылася 19 сакавіка 2006 года. Я не згодны з такой пастаноўкай пытання. А хто будзе разграбаць наступствы, якія ўзніклі перад і пасля 19 сакавіка? Сотні ўдзельнікаў тых падзей апынуліся за кратамі, аштрафаваны, згубілі працу, выключаны з ВНУ. Дзякуй Богу, Аляксандр Мілінкевіч, у адрозненне ад Анатоля Лябедзькі, не адышоў у бок, а распачаў кіпучую дзейнасць, аб чым я сказаў вышэй. Пагадненне павінна дзейнічаць, пакуль не будзе

Сапраўды, не адзін Мілінкевіч вінаваты ў тым, што апазіцыя церпіць паразу за паразай...

Фота photo.bymedia.net

неяк вырашаны, аблегчаны лёс кожнага пацярпелага ад супрацьпраўных дзеянняў улады. У гэтым сэнсе Аляксандр Мілінкевіч паказаў сябе як сапраўдны лідэр, змагар, які неабыякава ставіцца да людскіх лёсаў, імкнецца трымаць слова.

Адразу пасля сакавіцкіх, 2006 года, падзей Анатоль Лябедзька заяўляў, што надалей усё будзе вырашаць вуліца. Прайшоў год, і ён змяніў сваю думку. Пра ініцыятыву Аляксандра Мілінкевіча — усе намаганні накіраваць на тое, каб годна адзначыць 25 сакавіка Дзень волі, Лябедзька ў тым жа сваім артыкуле неяк абыякава кажа: “Раптам прачнулася ў таго ж Мілінкевіча жаданне арганізаваць вулічныя акцыі — зялёнае святло. Прадэманстраваў вынік — вось ты і лідэр”. Па-першае, Лябедзька яшчэ не прэзідэнт і нават не мэр горада, каб вырашаць — даваць ці не даваць зялёнае святло; па-другое, атрымліваецца так, што Лябедзьку і яго партыі як быццам няма ніякай справы да Дня волі. Яны — стороннія назіральнікі. І яны ўжо паказалі сябе, адмовіўшыся распаўсюджваць улёткі, падрыхтаваныя Патрыяй БНФ да 25 сакавіка. Я — беспартыйны, мне ўжо пайшоў восьмы дзесятак, нягледзячы на гэта я хоць і не надта шмат, але сотню тых улётак распаўсюдзіў.

Калі нават у гэтай святой справе, як Дзень волі, між партыямі няма адзінства, аб якім новым кангрэсе можна гаварыць? Аляксандр Мілінкевіч мае рацыю, калі заяўляе, што Кангрэс склікаць зараз — заўчасна. Спачатку трэба ўдакладніць пазіцыі і мэты партыйных лідэраў і партый, каб на Кангрэсе не атрымалася, як у байцы Крылова “Лебедзь, шчупак і рак”.

Мне не зусім зразумела, як можна быць у хаўрусе з камуністамі, калі яны нават і “калякінцы”. Хтосьці можа сказаць, што яны з чырвона-карычневых пераўтварыліся ў ружовых, што іх праграма як у сацыялістаў. Нічога падобнага я не заўважыў. Яны як былі, так і засталіся махровымі камуністамі. Яны не прызнаюць нашы нацыянальныя каштоўнасці. Яны па-ранейшаму ўскладваюць кветкі да помніка міжнароднаму злачынцу, кату, душыцелю нашай незалежнасці — Уладзіміру Ульянаву, партыйная клічка — Ленін. А гэта азначае, што камуністы-калякінцы апраўдваюць чырвоны тэрор, ГУЛАГі, Курапаты, генацыд беларускага (і не толькі беларускага) народа. Я разумею, што гэта злачынствы камуністаў папярэдніх пакаленняў. Але ж я не чуў, каб сучасныя камуністы асудзілі сваіх натхняльнікаў і настаўнікаў.

Кіраўнікі ПКБ не прызнаюць БНР. Яны заяўляюць, што Беларусь атрымала дзяржаўнасць у сувязі з утварэннем БССР. Але што БССР сабой уяўляла напачатку — усе ведаюць.

Я поўнасцю згодзен з Мілінкевічам наконт таго, што кіраўнік кааліцыі павінен быць паўнавартасным, прызнаным усімі суб’ектамі, абраным на Кангрэсе ці іншым фарматам. Толькі ў такім выпадку з ім будуць размаўляць за мяжой на высокім узроўні. Я звяртаюся да кіраўнікоў апазіцыйных партый: хопіць займацца самазахапленнем, хопіць займацца самалюбаваннем, хопіць займацца нарцысізмам. Трэба пераступіць цераз саміх сябе і пачаць займацца агульнай справай. Самае важнае для нас у першую чаргу — гэта абарона незалежнасці. Пагроза існуе. Нельга верыць Лукашэнку, калі ён спрабуе запэўніць грамадства, што незалежнасць краіны для яго — святое. Заўтра ён можа сказаць адваротнае. Нам трэба быць напагатове.

У сваім артыкуле “Слова аб Кангрэсе”, маючы на ўвазе прэзідэнцкія выбары 19 сакавіка 2006 года, Анатоль Лябедзька паставіў, як ён кажа, пытанне часу: “А дзе вынікі?” Незразумела, каму ён гэтае пытанне адрасуе? Адказ на гэтае пытанне быў вядомы яшчэ да Кангрэса дэмакратычных сіл, і не вельмі важна, хто быў абраны “адзіным”. “Вынікі” ў існуючых умовах не залежаць ад таго, як прагаласуюць выбаршчыкі. Яны, вынікі, залежаць ад таго, як і хто галасы лічыць. Магчыма, 9 верасня 2001 года перамог Ганчарык, магчыма, 19 сакавіка 2006 года бліскучую перамогу атрымаў Аляксандр Мілінкевіч. Але пра тое мы ніколі не даведаемся. Бюлетэні хутчэй за ўсё ўжо знішчаны, засталіся толькі “выніковыя” пратаколы Цэнтрвыбаркама.

Ілля КОПЫЛ,
жыхар Мінска.

ЧУЛІ?

Скрабец будзе разлічвацца з «Беларусбанкам» 300 гадоў?

У былога дэпутата Сяргея Скрабца апісалі маёмасць дзеля пагашэння запазычанасці перад “Беларусбанкам”. Па прыгаворы Вярхоўнага суда, Сяргей Скрабец мусіць выплаціць паўтара мільярда рублёў (каля 700 тысяч долараў), якія нібыта выманіў у дзяржавы ў той час, калі быў дэпутатам.

Судовы выканаўца Аляксандра Шумейка апісала аўтамабіль Аўдзі-80 1988 года выпуску, дываны, тэлевізар, сувеніры, халадзільнік, электрапліту, не пагрэбавалі і зламанай пральнай машынай. Штомесяц вяртаючы па 20 долараў ЗША, Сяргей Скрабец, як падлічылі журналісты, здолее пагасіць запазычанасць цягам 300 гадоў. Дасюль палітык не здолеў нідзе працаўладкавацца.

www.charter97.org

КАНФЛІКТ

Касцёл альбо гатэль?

Мінская рымска-каталіцкая абшчына святога Іосіфа, зарэгістраваная ў Чырвоным касцёле сталіцы, сабрала ўжо 773 подпісы пад зваротам да кіраўніка дзяржавы з заклікам вярнуць вернікам помнік архітэктуры барока XVII стагоддзя — комплекс будынкаў манастыра бернардынцаў з касцёлам, размешчаных па вуліцы Кірыла і Мяфодзія, 4,6,8.

Як паведаміла БелаПАН член камітэта абшчыны Івона Мацукевіч, збор подпісаў пачаўся 7 сакавіка пасля таго, як стала вядома аб планах Мінскага гарвыканкама перадаць будынкі інвестарам для іх рэканструкцыі і прыстасавання пад гатэльны комплекс і аб’екты гандлёва-бытавога прызначэння. *“Ужо 13 сакавіка мы накіравалі звароты з 773 подпісамі прэзідэнту краіны, а цяпер працягваем гэту акцыю”,* — сказала І.Мацукевіч.

“Самае страшнае — калі людзей падманваюць улады, — заявіла яна. — *У маі мінулага года, яшчэ за некалькі дзён да рашэння Мінгарвыканкама аб перадачы святыні інвестарам нас запэўнівалі ў тым, што будынкі будуць вернуты вернікам”.*

Прыхаджанін абшчыны Алесь Белы ў сваю чаргу звярнуў увагу на тое, што манастыр бернардынцаў, узведзены на сродкі дабрачынцаў, а не казны, быў незаконна канфіскаваны ў 1864 годзе ўладамі Расійскай імперыі пасля падаўлення нацыянальна-вызваленчага паўстання супраць рускага царызму пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. *“І ў незалежнай Беларусі трэба было б адмяніць гэту несправядлівасць, тым больш што ў сталіцы, дзе 30 каталіцкіх абшчын маюць толькі шэсць храмаў, катастрафічна не хапае касцёлаў”,* — сказаў А.Белы.

У інтэрв’ю БелаПАН старшыня грамадскага аб’яднання “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны” Алег Трусаў паведаміў, што ТБМ таксама пачало збор подпісаў за перадачу вернікам будынкаў былога манастыра.

Зараз у будынку былога храма размяшчаюцца Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі і Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Пачынаючы з 19 сакавіка 2004 года вернікі двойчы ў дзень праводзяць малебны каля будынка былога касцёла. Вечарам 19 сакавіка, у дзень святога Іосіфа, каля сцен былога храма вернікі плануюць адзначыць другую гадавіну малебнаў за вяртанне святыні.

Марат ГАРАВЫ.

О ЧЕМ ГОВОРЯТ...

Министр Потупчик сбил человека

Пострадавший от полученных травм скончался в больнице

Это дорожно-транспортное происшествие произошло еще 9 марта, около 11 часов вечера. Но в милицейские сводки почему-то не попало. Однако журналистам интернет-издания “Ежедневник” удалось узнать подробности ДТП с участием высокопоставленного чиновника.

Министр труда и социальной защиты Владимир Потупчик ехал в Минске на собственном автомобиле “Ауди-100" по ул.Притыцкого. Вместе с ним в машине находилась его дочь Ульяна. Министр, к несчастью, совершил наезд на находившегося на дороге неизвестного мужчину. К чести министра, он не скрылся с места происшествия, а вызвал "скорую", ГАИ и попытался оказать помощь пострадавшему. Несмотря на позднее время и праздничные дни, на место ДТП тут же прибыли замначальника УГАИ ГУВД Мингорисполкома и начальник отдела ГАИ УВД Фрунзенского района.

Позже Ульяна Потупчик расскажет журналистам, что улица в этом месте была плохо освещена. Перед машиной министра двигался еще один автомобиль. Но он неожиданно резко свернул вправо, и перед их “Ауди” возник человек. Среагировать на внезапно изменившуюся ситуацию на дороге у водителя, по словам Ульяны, времени не было. Эти показания подтвердит и водитель ехавшей впереди машины.

Как было установлено медиками, в результате ДТП потерпевший получил черепно-мозговую травму тяжелой степени с переломом свода и основания черепа. Его доставили в 9-ю Городскую клиническую больницу, где он, не приходя в сознание, скончался, не дожив до утра.

Через несколько дней удалось установить и личность погибшего. Им оказался 27-летний житель городского поселка Ивенец Воложинского района. Погибший был осужден за кражу и с 23 февраля 2007 года отбывал наказание в исправительном учреждении открытого типа (в простонародье — “на химии”) №37, расположенного в Воложине. Согласно сообщению администрации ИУОТ №37, погибший 6 марта самовольно покинул исправительное учреждение и числился в бегах.

Что грозит министру?

Окончательно картину произошедшего должно прояснить начатое расследование. Материалы проверки данного ДТП переданы в прокуратуру Минска. Пока уголовное дело не возбуждено. Стоит отметить, что, согласно указу Александра Лукашенко, с недавних пор в нашей стране привлечь к уголовной ответственности высокопоставленного чиновника можно только с его личного разрешения.

Если расследование установит вину водителя, министр будет нести ответственность, согласно ч.2 ст.317 УК РБ — нарушение Правил дорожного движения или эксплуатации транспортных средств лицом, управляющим транспортным средством, повлекшее по неосторожности смерть человека. Данная статья предусматривает наказание исправительными работами на срок до двух лет, или ограничением свободы на срок до пяти лет, или лишением свободы на тот же срок с лишением права занимать определенные должности или заниматься определенной деятельностью или без лишения.

В тему

К сожалению, в Беларуси нередко случаются ДТП, в которых гибнут люди. Иногда за рулем автомобилей, совершивших наезд на пешеходов, сидят высокопоставленные чиновники.

В 1993 году тогдашний депутат Верховного Совета 12-го созыва **Дмитрий БУЛАХОВ** совершил наезд на пожилую женщину у деревни Белыничи. Прокуратура позже установит, что Булахов не являлся виновником того ДТП. Хотя в кулуарах Верховного Совета будут говорить, что Булахов незаконно получил водительское удостоверение, что практики вождения машины у него не было, что смерть женщины была на его совести. Кто-то даже упрекал тогдашнего председателя Верховного Совета Станислава Шушкевича в малодушии. Что, мол, прояви он принципиальность и дай ход делу Булахова, возможно, Дмитрий был бы жив и сегодня. А так жил с чувством вины...

В начале 2000-х годов в связи с гибелью человека в результате ДТП дважды упоминалась фамилия нынешнего посла Беларуси в России, а тогда руководителя Брестской области **Василия ДОЛГАЛЕВА.** Первый раз его служебная машина сбила учительницу, второй раз бывшего осужденного. Тогда тоже проводились расследования. Первый раз следователи решили, что виновна в ДТП погибшая женщина, а во второй раз — водитель Долгалева. Хотя, по неофициальной информации и свидетельствам некоторых очевидцев, за рулем сидел сам Долголев (или, по крайней мере, человек, очень на него похожий).

Что ж, в Беларуси многое, как говорят, остается за кадром

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

САКАВІЦКІЯ МАТЫВЫ

Ніл ГІЛЕВІЧ

Усё хапаюць...

А маладых усё хапаюць,
Усё хапаюць і хапаюць —
Па двух, па трох
Па пяць, па дзесяць, —
Усё хапаюць і хапаюць,
І ў ізалятар запіхаюць,
І люта палкай лупяць-месяць,
Каваным ботам б’юць пад дых —
“Закону” вучаць маладых.

І зноў хапаюць і хапаюць,
А маткі бедныя ўздыхаюць
І горка плачуць: гора нам!
Але сваім арлам-сынам
Вымоў-папрокаў не кідаюць,
Бо добра ведаюць яны —
Калі ў пакутах слёзы роняць, —
Што толькі мужныя сыны
Іх гонар матчын абароняць.

2007, сакавік

Жахліва

Ну вось і дазналіся мы
з сакрэтных архіўных папер,
што Сталін, у бытнасць сваю
дыктатарам эС эС эС эР,
сам, сам падпісаў на расстрэл
(уласнай рукой, асабіста)
амаль трыста семдзесят
спіскаў —
прыблізна на сорак пяць тысяч
дзяржавы сваёй грамадзян.
А ў цэлым з ягоным удзелам
і з волі садысцкай ягонай
былі расстраляны, забіты,
замучаны голадаморам,
хваробамі, сцюжай сібернай,
біццём у катоўнях — мільёны,
мільёны, мільёны людзей...

Ад гэтага ведання мы
павінны былі звар’яцець,
не вынесшы грузу такога
на кожную фібру душы.

І мы звар’яцелі, нарэшце.

Не раптам усе, не адразу —
паціху, патроху, памалу,
адзін за адным, паступова.
(Псіхолагі-медыкі знаюць:
працэс пераходу ў вар’яцтва
бывае парой непрыкметны,
спярша і адрозніць няможна,
ці ўжо ты гатоў, ці яшчэ...
Ці ўжо ты, шчасліўчык, не волен
шалопіць сваімі глуздамі,
ці трохі яшчэ разумееш:
навошта, чаму і куды?..)

Але, паўтараю, нарэшце
мы ў масе сваёй звар’яцелі
і крыкнулі голасна хорам:
“Адновім жа Лінію Сталіна!
І статуй хай будзе пастаўлены
у памяць, у славу, у гонар
бязмернай любові ягонай
да з’едзеных ім жа мільёнаў
нявінных сваіх грамадзян!..”

Жахлівае сталася нешта
на нашай зямлі беларускай,
жахлівае, страшнае вельмі...
Каб так адвалілася памяць?..
Каб так адабрала мазгі?..
Каб так амярцвела сумленне?..
І так пачувацца шчасліва?..
Жахліва, браточкі, жахліва.

2007, студзень—сакавік

Аповед пра трубу

Пачну празаічна.
Як, зрэшты, і кончу,
па праўдзе сказаць.
Бо гэта жыццёвая проза
не можа
прыгожай метафарай стаць.

Не тая матэрыя.
Не для паэзіі.
Тут трэба мовіць прасцей.
Дык вось: запрасілі мяне —
яшчэ восенню гэта было —
На сустрэчу ў ліцэй.
Звычайная рэч: літаратар
павінен прыходзіць
са словам любві да людзей.

І я ўжо сабраўся.
Крыху прыкасцюміўся нават.
І кніжачкі склаў у партфель.
Сказалі: “У дзесяць
Прыедзем па вас на машыне”.
Ну што ж! На машыне лацвей.

Сяджу і чакаю.
Амаль а дзесятай —
Званок тэлефонны: — Ало!
Прашу прабачэння,
сустрэча, на жаль, не
адбудзецца:
нас заліло!
Прарвала трубу —
і ўвесь першы паверх
затапіла вада.
Дык вы ўжо даруйце,
мне вельмі няёмка, паверце,
і вельмі шкада...

Праз тыдзень
мяне запрасілі
сустрэцца з людзьмі ў РДК.
“Ну, добра!” — сказаў.
“Мы прыедзем забраць вас.
Чакайце званка!”

Чакаў. Дачакаўся.
І раптам у слухалцы чую
не радасць, а скруху-журбу:
— Прабачце, сустрэчы не будзе.
Аварыя ў нас тут:
прарвала трубу.
Усё заліло-затапіла!
Такая во стрэслася
неспадзявана бяда.
Дык вы ўжо даруйце,
мне вельмі няёмка, паверце,
і вельмі шкада...

Праз месяц —
якраз, калі я ўжо сабраўся
ісці на сустрэчу ў каледж, —
Званок тэлефонны:
— Даруйце, мне вельмі
няёмка і прыкра, але ж...
— Ну што? — перабіў я. —
Прарвала трубу —
І падлога затоплена ўся?
— Ой! — ойкнула слухалка. —
Праўда, прарвала.
А як вы даведаліся?

— Спадарыня мілая,
як жа не ведаць
пра гэта мне дома, калі
ужо гэта ведаюць
скрозь у Еўропе,
а мо і на цэлай зямлі!
Так, так, ужо ведаюць,
што ў Беларусі
гадоў, можа, з дзесяць таму
трубу разарвала —
і справіцца з гэтай
аварыяй страшнай
няма ў нас каму.
Дык гоніць і гоніць,
і прэ, і нясе, і фугуе,
і ўсё заліває наўсцяж —
такім заліває,
што часам дыхнуць
немагчыма...
О Госпадзе Божа ты наш!

P.S. Мае чытачы дарагія,
мае аднаверцы,
я вельмі вас вельмі прашу:
не клічце мяне
да сябе на сустрэчу, сябры,
не вярэдзьце душу.
Чытайце — пакуль дзікуны
не пакідалі ў вогнішча —
кнігі і кніжкі мае.
Пасля і сустрэчы прадоўжым.
Прадоўжым!
Час прыйдзе.
Наступіць.
Ужо настае.

2007, сакавік.

Баечка пра грыб

Грыб жарэ літаратуру,
Як падлогу ў хаце — рыхтык.
Неабачна гоцнеш здуру —
І памост праломіш дрыхлы.

Вунь паэт быў. Нават з імем.
Гоцнуў раз — і шусь у пограб!
А ўжо там — гурма! І з імі
Моркву ён храбошча ўпохраб.

І празаік — у скляпенні.
Галяпуе — рэха ў хаце:
“Я ўжо, хлопцы, не пісьменнік!
Я ўжо, хлопчыкі, пісацель!”

Во, той грыб — брыда якая!
Лек адзіны — антысептык.
Кажуць: дохне і знікае.
Але я — вялікі скептык.

2007, сакавік

Верш “Не бядуйце!..” друкаваўся ў “Народнай волі” ў 1997 годзе, але я рашыў уставіць яго ў гэту падборку, бо сёння ён непараўнана больш актуальны, чым быў тады. У паэзіі такое здараецца. — **Н.Г.**

Не бядуйце!..

Не бядуйце, настаўнікі мілыя,
Што з праграм і падручнікаў школьных
Песні-думы паэта праўдзівыя
Выдзяўбаюць, як шкоднікаў шкодных.

Выдзяўбаюць з той самай нянавісцю,
Як калісь, на крывавым правесні,
Каршуны, што віселі тут навіссю,
Выдзяўбалі Купалавы песні.

Выдзяўбаюць!.. А хто ж бо заступіцца?
Хто падымецца? Хто абароніць?

Белы зайчык пад кусцікам туліцца.
Звон на вежы знямелай не звоніць.

Звон не звоніць... Ды хоць і панылыя
Па калдобінах цягнуцца будні —
Не бядуйце, настаўнікі мілыя:
Шчырым песням не згінуць ад блудні.

З тых праграм, што ваююць, як ратнікі,
За свабоду — ніякім дэкрэтам
Іх не зняць! Калі нават сцярвятнікі
Заўтра выдзеўбуць сэрца паэта.

1997.

ВНИМАНИЕ!

Рыбный «отпуск»

В соответствии с Правилами ведения рыболовного хозяйства и рыболовства, с 1 апреля по 30 мая запрещается лов всех видов рыбы, и связано это с периодом нереста.

Запрет не распространяется на так называемое любительское рыболовство: “одной поплавковой удочкой с одним крючком на рыболова или спиннингом в светлое время суток с берега”. Но даже любителям запрещено ловить определенные виды рыб в период их массового нереста. Так, сейчас (до 30 марта) запрещен лов щуки, с 1 июня по 1 июля — сома, с 15 октября по 15 июля — рака узкопалого, с 1 апреля по 15 июня — пресноводных креветок.

Напомним также, что существуют строгие правила любительского рыболовства и в “незапрещенный период”: разрешается лов спиннингом, донкой и различными удочками с одновременным использованием одного или различных видов орудий рыболовства с общим количеством крючков не более 10 штук на рыболова. При этом улов на рыбака не должен превышать 5 кг в сутки. В случае, если одна рыба потянула более чем на 5 кг, ее можно брать домой, но больше ловить в эти сутки нельзя.

Игорь МОРОЗОВ.

УВАГА!

Час — уперад!

Як паведаміла Міжведамасная камісія па часе і эталонных частотах Рэспублікі Беларусь, 25 сакавіка 2007 года ў адпаведнасці з парадкам вылічэння часу на тэрыторыі краіны будзе здзейснены пераход на “летні” час. Такім чынам, 25 сакавіка ў 2 гадзіны ночы стрэлкі гадзінніка пераводзяцца на адну гадзіну ўперад.

Ул.інф.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 САКАВІКА 2007 г.

СИТУАЦИЯ

Стрелочник?

Его признали виновным в гибели 90 тысяч кур и обязали выплатить птицефабрике почти 125 тысяч долларов материального ущерба, но коллеги со всей страны просят оправдать ветеринара

В августе прошлого года на птицефабрике "Беларуснефть-Особино" в Буда-Кошелевском районе Гомельской области случилось ЧП. В течение двух суток на предприятии погибло более 90 тысяч цыплят-бройлеров, предприятию был нанесен ущерб в размере 500 миллионов белорусских рублей.

Следствие по факту гибели кур длилось три месяца. Около месяца дело слушалось в Гомельском областном суде.

Приговор суда был суров. Главный ветврач предприятия и главный технолог были признаны виновными в ненадлежащем исполнении своих служебных обязанностей, повлекшем по неосторожности причинение ущерба в особо крупном размере. Ветврача Александра Осипенко суд приговорил к одному году лишения свободы с запретом два года занимать руководящие должности на ветеринарных станциях и обязал выплатить ущерб предприятию в размере 250 (!) миллионов рублей.

Когда обстоятельства этого дела стали широко известны, в защиту Александра Осипенко выступили сотни сотрудников птицефабрик, ветеринарных лабораторий и станций всей страны. Практически все они не были знакомы с осужденным, никогда с ним не встречались. но все понимали — молчать нельзя. Случись завтра подобное ЧП на их предприятии, каждый может оказаться на месте Александра Осипенко. По их мнению, в роли стрелочника...

Как это было

Александр Осипенко до мельчайших подробностей помнит все, что происходило на птицефабрике 5 августа 2006 года.

"Был выходной день, суббота, — рассказывает Александр Владиславович. — *В полдень мне позвонил ветврач бройлерного цеха и сказал, что в трех птичниках из четырнадцати наблюдается повышенный падеж птицы. Через полчаса я был на птицефабрике. Мы произвели вскрытие кур, но установить причину падежа не смогли. Характерных изменений в органах, которые возникают при кормовом отравлении, не наблюдалось. Требовалось лабораторное исследование, чтобы выяснить причину падежа. Я провел весь комплекс лечебно-профилактических мероприятий. Ситуация стабилизировалась, падеж прекратился, и я уехал домой".*

Однако в 17 часов Александра Осипенко снова вызвали на предприятие. Падеж кур начался уже в других птичниках.

"Я снова примчался на работу, — продолжает свой рассказ ветврач. — *В те дни стояла очень жаркая погода. Температура в птичниках тоже превышала допустимые нормы. Вентиляция, которая установлена на фабрике, устарела, она не способна обеспечить необходимый микроклимат. Снизить температуру объективно невозможно. Можно было подумать, что причина падежа в плохой вентиляции и жаркой погоде. Очень опасались, что, может быть, это птичий грипп. Но выяснилось, что дохла перерощенная птица, возраст которой 55 дней при норме 42—43 дня. Кроме того, питалась эта птица одной и той же партией корма, который поступил на фабрику 3 августа. Вот тогда и возникло подозрение, что причина падежа птицы в плохом корме".*

Александр Осипенко говорит, что отстранить птицу от корма без соответствующего распоряжения директора птицефабрики он не имел права. Если птицу не кормить сутки, она может получить кормовой стресс и погибнуть уже от голода. Значит, необходимо было приготовить новую партию комбикорма.

"Вызвать на работу сотрудников в выходной день мог только директор, — Александр Осипенко старается не волноваться. — *Но на предприятии его не было, а трубку рабочего мобильного телефона он не снимал. Я смог дозвониться только с мобильника жены. В ее телефоне есть функция "подавление номера", и директор не знал, откуда ему звонят. Он находился в Калинковичах и сказал, что приедет на фабрику только к 23.00 и чтобы без него никаких действий мы не предпринимали...*

Зайдя на птичники, директор произнесет заветные слова: "Поднять кормушки". И ему — медаль, а нам — кочерыжки. Хотя падеж после отстранения птиц от корма все равно наблюдался. Птице два дня скармливался некачественный комбикорм без видимых клинических изменений. Это привело к необратимым последствиям на биохимическом уровне.

Согласно должностной инструкции и ветеринарному законодательству, ветврач может запретить использовать для кормления птиц корм только тогда, когда его качество можно определить визуально. Например, корм заплесневевший, почерневший, затхлый. Но данный корм поступил на фабрику еще 3 августа, вторые сутки птиц кормили этим комбикормом. Визуально корм был хорошего качества. Кроме того, данный корм поступил с Узовского комбината, где есть производственная лаборатория по проверке качества и который выдает качественное удостоверение о пригодности комбикорма к скармливанию".

О том, что причина падежа кур — отравление кормом, стало известно в воскресенье. При вскрытии падшей птицы уже были видны характерные признаки отравления — кровоизлияние в желудок, увеличение желчного пузыря, подкожные отеки. Позже эту же причину гибели кур подтвердят и лабораторные исследования.

Кто виноват?

Следствие по факту падежа кур на птицефабрике "Беларуснефть-Особино" длилось три месяца. В ходе следствия обвиняемым по делу проходил только директор птицефабрики. Но за две недели до передачи дела в суд статус директора изменился — он уже проходил по делу как свидетель. Обвиняемыми стали главный технолог и главный ветврач птицефабрики Александр Осипенко.

Еще до суда оценку действиям ветврача Осипенко дал Главный государственный ветеринарный инспектор страны **Александр Аксенов.** В официальном письме на имя председателя Гомельского областного суда Аксенов указал, что *"главный ветврач РУП "Беларуснефть-Особино" Осипенко А.В. действовал в рамках ветеринарного законодательства Республики Беларусь"*, т.е. все его действия соответствовали закону и должностной инструкции. Аксенов также написал, что, по мнению Государственной продовольственной инспекции, *"следствие односторонне подошло к установлению круга виновных лиц"*, что *"не по всем пунктам постановления имеются документальные подтверждения вины обвиняемого"*, что *"причина и диагноз заболевания, вызвавшего массовую гибель птицы, ставится комплексно на основании анамнеза, клинических проявлений, патологоанатомических, лабораторных и других специальных исследований, а на эти исследования отводится установленный норматив времени"*, а также и то, что *"без внимания следователя остался вопрос — качество комбикорма и весь процесс его производства"*.

Генеральный директор Республиканского объединения "Белптицепром" **Н.Шерстнев** тоже дал заключение действиям ветврача птицефабрики — "со стороны главного ветврача Осипенко А.В. были предприняты исчерпывающие действия по выявлению причины падежа и сохранению птицеголовья". Судья Гомельского областного суда **В.Мельников** получил также официальные письма от главного ветврача Буда-Кошелевского района **Е.Фрейвальда,** начальника управления Комитета по сельскому хозяйству и продовольствию Гомельского облисполкома **В.Курпатова,** который лично участвовал в работе оперативного штаба на птицефабрике 5 августа. Оба они констатировали, что Александр Осипенко действовал правильно, не нарушил ветеринарного законодательства и в полном объеме провел весь комплекс профилактических и лечебных мероприятий.

Были в распоряжении суда и выводы ветеринарной экспертизы, проведенной специалистами ГУ "Белгосветцентра". В этом документе черным по белому написано, что птица отравилась некачественным кормом, а лечебные мероприятия в отношении заболевшей птицы были начаты своевременно. Специалисты "Белгосветцентра" также указали, что на птицефабрике "Беларуснефть-Особино" не соблюдались сроки выращивания птицы, температурный режим в птичниках, что комбикорм, который использовался для кормления птицы, содержал питательные вещества, рекомендованные для выращивания бройлеров до 42-дневного возраста.

Необходимое исследование иммунной системы птицы проводили и специалисты Института им.Вышелесского. Их заключение — бройлеры не болели вирусными и бактериальными заболеваниями.

Но, выходит, выводы специалистов разных ведомств Гомельский областной суд не принял к сведению. Ветврача Осипенко осудили за ненадлежащее исполнение своих обязанностей.

— В мои обязанности не входит общее руководство административно-хозяйственной деятельностью, как сказано в постановлении суда, — говорит Александр Осипенко. — Основной моей задачей является проведение ветеринарно-санитарных мероприятий, направленных на предупреждение возникновения и ликвидацию инфекционных заболеваний птицы. Я не отвечаю за своевременный убой птицы и реализацию продукции. Не я виновен в том, что в птичниках стоит птица, возраст которой превышает 42 дня. Этот вопрос, к слову, главный технолог производства каждый раз поднимала на собраниях у директора фабрики. Но вопрос не решался положительно. Решение об использовании комбикорма принимает главный зоотехник фабрики. Я не нарушил ничего, что касается проведения ветеринарно-санитарных работ в период июня-июля 2006 года. А 5 августа действовал согласно должностной инструкции и ветеринарно-санитарным правилам. Ветеринарная экспертная комиссия, к слову, подтвердила это.

Солидарность

О решении Гомельского областного суда сообщило Белорусское телевидение. Услышав, что виновным в падеже 90 тысяч кур признан главный ветврач птицефабрики Александр Осипенко, ведущий ветврач-эпизоотолог Гомельской областной ветлаборатории Максим Яковиц решил собрать подписи в защиту коллеги.

"Я не был лично знаком с Яковицем, — говорит Александр Осипенко. — *Он позвонил мне через несколько дней после суда, сказал, что не понаслышке знает о моем деле, и попросил разрешения начать сбор подписей в мою защиту. Я не стал возражать".*

Письмо в защиту Александра Осипенко подписали сотни человек, подписи ставили целыми коллективами —- Гомельская облветлаборатория, Гомельская районная ветеринарная станция, Могилевская, Гродненская, Брестская облветлаборатории, РУ "Калинковичская районная ветеринарная станция", Мозырская районная ветеринарная станция и многие, многие другие. Не остались равнодушными к судьбе коллеги ветврачи птицефабрики "Рассвет", Оршанской птицефабрики, Смолевичской и других. Всего было собрано 36 листов подписей. Копии письма были разосланы во всевозможные инстанции — в Администрацию президента, Совет министров, Палату представителей, Генпрокуратуру, МВД, Комитет госконтроля.

Ответ подписанты получили пока только из Генпрокуратуры. Им ответили, что писать такие письма они не имеют права, поскольку не относятся к обвиняемым...

В конце марта коллегия по уголовным делам Верховного Совета будет рассматривать кассационную жалобу Александра Осипенко. Он, естественно, с приговором Гомельского областного суда не согласен.

— Странно получается: действовал по закону, а оказался виновным, — говорит Александр Осипенко. — Сейчас я в отпуске, что будет потом — не знаю. Откуда взять деньги, чтобы выплатить такой материальный ущерб, тоже не могу представить. Моя зарплата на фабрике составляла около миллиона рублей. Очень надеюсь, что Верховный суд внимательно изучит мое дело... Знаете, когда шло следствие, я даже представить себе не мог, что могу оказаться на скамье подсудимых. Думал, какая-то ошибка произошла, следователь молодой, не разобрался в нюансах, потому что дело сложное, узкоспециализированное. Но в суде, на мой взгляд, тоже не очень-то стремились разобраться в сути дела. Очень надеюсь на честный и справедливый подход к моей жалобе Верховного суда...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ЗАДУМАЕМСЯ!

Беларусь захлынула рускамоўная літаратура

Летась у Беларусі было выпушчана амаль 12 тысяч выданняў агульным накладам прыкладна 52 мільёны асобнікаў. Пры гэтым 9 тысяч 996 выданняў накладам прыблізна 45 мільёнаў выйшла на рускай мове.

Пра гэта ў Мінску на Беларускім форуме русістаў паведаміў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыня пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Мікалай Чаргінец. Дык ці не надышоў час успомніць нарэшце родную беларускую мову?

Ул.інф.

Больш за тысячу беларускіх кніг патрапілі пад арышт

Больш за тысячу гістарычных кніг канфіскаваны з мінскай кватэры, дзе знаходзіцца маёмасць "Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Супрацоўнікі міліцыі і КДБ на працягу чатырох гадзін праводзілі ператрус, правяралі дакументы, аргтэхніку і кнігі. Падставай для гэтага была нібыта скарга суседзяў.

Прэтэнзій да выдадзеных у Беларусі кніг у праваахоўнікаў не было. Былі забраныя 1067 экземпляраў надрукаваных у Літве кніг: Юрыя Туронка "Людзі СБМ", Юркі Віцьбіча "Антыбальшавіцкія паўстанні і партызанская барацьба на Беларусі" і Дзмітрыя Касмовіча "За вольную і суверэнную Беларусь".

Ул.інф.

АФІЦЫЙНА

Не ўсё ў парадку з дэкларацыяй?

У Беларусі фізічныя асобы могуць падаць удакладненыя дэкларацыі аб сукупным даходзе за 2006 год і ўнесці любыя змяненні ў раней прадстаўленую дэкларацыю без якіх-небудзь санкцый з боку падатковых органаў да 15 мая пры ўмове, што ў згаданы тэрмін падатак будзе выплачаны ў поўным аб'ёме. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства па падатках і зборах.

Па стане на 1 сакавіка 2007 года ў падатковыя органы Беларусі было прадстаўлена 232.405 падатковых дэкларацый аб сукупным гадавым даходзе за 2006 год. У тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі прадстаўлена 20.803 дэкларацыі, фізічнымі асобамі — 211.602. У параўнанні з аналагічнай леташняй датай колькасць прадстаўленых дэкларацый павялічылася на 77.106, або ў 1,5 раза. Прадстаўнікі МПЗ тлумачаць гэты рост у першую чаргу тым, што многія грамадзяне звярнуліся па вяртанне падаходнага падатку і па іншыя падатковыя вылікі, якія можна атрымаць шляхам падачы дэкларацый.

У сувязі з гэтым МПЗ паведамляе, што грамадзяне, якія на працягу года не поўнасцю скарысталі льготы па падатку або права на выключэнне расходаў з абкладаемага даходу з мэтай вяртання залішне ўтрыманых сум падаходнага падатку, могуць падаць дэкларацыю для атрымання льготы па падатку на працягу трох гадоў з моманту яго ўплаты.

Ул.інф.

СІТУАЦЫЯ

Забароненая гісторыя

Вышэйшая атэстацыйная камісія (ВАК) Беларусі не зацвердзіла кандыдацкую дысертацыю аспіранткі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржуніверсітэта ***Ірыны КАШТАЛЯН*** *на тэму "Штодзённае жыццё беларускага грамадства ў 1944—1953 гадах".*

Паводле слоў І.Кашталян, у канцы верасня 2006 года пры аднадушнай падтрымцы ўсіх членаў савета БДУ па абароне дысертацый па айчыннай гісторыі даследаванне атрымала станоўчую адзнаку, аднак экспертны савет ВАК па гістарычных навуках пад старшынствам доктара гістарычных навук, прафесара Яўгена Новіка, а затым і прэзідыум ВАК яе не зацвердзілі.

У якасці матывацыі такога рашэння ў знешняй экспертызе дысертацыі, у прыватнасці, зазначана: *"Матэрыял павінен прывесці чытача да высновы, што Савецкая дзяржава была не роднай маці, а злой бессардэчнай мачыхай для беларускага народа, што функцыянаванне гэтай дзяржавы-монстра супярэчыла натуральнай прыродзе чалавека".*

Прычыну такіх адносін да сваёй работы І.Кашталян бачыць у тым, што пасляваенная сітуацыя, прадстаўленая ёю ў даследаванні, кардынальна адрозніваецца ад той, што выкладзена ў падручніках. Гісторык гатова адстойваць сваю правату ўсімі законнымі сродкамі, у тым ліку ў судзе, а ў выпадку адмовы плануе перанесці абарону дысертацыі за межы Беларусі.

Варта зазначыць, што работа І.Кашталян з'яўляецца першым даследаваннем у беларускай гістарыяграфіі па праблемах штодзённага жыцця беларускага грамадства.

Марат ГАРАВЫ.

СУД

Ад 12 да 15

Пазбаўленне волі на тэрмін ад 12 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці — такія прыгаворы вынесены членам арганізаванай злачыннай групы, якія ўчынілі шэраг цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў на тэрыторыі Беларусі.

З вясны 2004-га па восень 2006 года злодзеі ўчынілі больш за 60 злачынстваў — у асноўным гэта былі крадзяжы, у тым ліку аўтамабільныя, рабаванні, разбоі, а таксама ўзброеныя напады на грамадзян, установы і арганізацыі.

Так, у студзені 2005 года злачынцы, схаваўшы твары пад маскамі, учынілі ўзброены напад на аператара аўтазаправачнай станцыі Смаргонскага філіяла РУП "Беларуснафта-Гроднааблнафтапрадукт". Пад пагрозай прымянення насілля пацярпелы быў вымушаны аддаць выручку ў суме больш за 5 млн рублёў.

У верасні таго ж года злачынцы абрабавалі касу філіяла РУП "Мінскэнерга" ў вёсцы Лебедзева Маладзечанскага раёна. Пад'ехаўшы на скрадзеным аўтамабілі, яны збілі вартаўніка, прабраліся ў памяшканне і забралі сейф разам з грашыма. У сейфе знаходзілася 228 тысяч рублёў, у той час як злачынцы разлічвалі на большае: паводле іх інфармацыі, касір павінна была прыняць больш за 560 млн рублёў для выдачы зарплаты. Дастаўка гэтых грошай у прызначаны час не адбылася па тэхнічных прычынах.

Ірына ЛЕЎШЫНА.

Сам сябе асудзіў

У Гомельскім следчым ізалятары, дзе працягваецца закрыты судовы працэс над удзельнікамі злачыннай групоўкі "пажарнікі", скончыў жыццё самагубствам адзін з фігурантаў па гэтай справе.

Пры гэтым прадстаўнікі МУС абвяргаюць інфармацыю недзяржаўных СМІ пра тое, што "пажарнік" перарэзаў сабе горла лязом, але пра сапраўдныя абставіны здарэння не гавораць. Не называецца і прозвішча загінуўшага.

Нагадаем, на лаве падсудных знаходзіцца другая група ўдзельнікаў злачыннай арганізацыі — 19 чалавек. Удзельнікі першай (27 чалавек) былі асуджаны на тэрміны ад 3 да 14 гадоў пазбаўлення волі ў мінулым годзе.

Групоўка "пажарнікі" ўзнікла на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў сярэдзіне 1990-х гадоў і праіснавала 10 гадоў. Члены гэтай злачыннай арганізацыі займаліся разбоямі, крадзяжамі, вымагальніцтвам, незаконным аўтабізнесам. Усяго яны ўчынілі больш за 100 злачынстваў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

РЭПРЭСІІ

Ці рассакрэціць беларускі КДБ дакументы пра катынскую трагедыю?

У архіве КДБ Беларусі павінны захоўвацца спісы 3870 афіцэраў польскай арміі, расстраляных у БССР у 1940 годзе. Такое меркаванне выказаў вядомы беларускі даследчык гісторыі сталінскіх рэпрэсій, кандыдат гістарычных навук Ігар Кузняцоў.

Выступаючы ў Мінску на пасяджэнні "круглага стала" беларускіх гісторыкаў па праблемах вывучэння сталінскіх рэпрэсій, вучоны адзначыў, што міжнароднае гісторыка-асветніцкае, дабрачыннае і праваабарончае таварыства "Мемарыял" некалькі гадоў займаецца пытаннямі, датычнымі Катынскага злачынства. *"Размова ідзе пра расстрэлы ў красавіку-маі 1940 года каля 22 тысяч афіцэраў польскай арміі, якія былі інтэрніраваны падчас так званага вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939 года і знаходзіліся на тэрыторыі СССР. Паводле звестак "Мемарыяла", былі расстраляны 14.552 афіцэры польскай арміі ў трох лагерах — двух на тэрыторыі Расіі (Казельскім каля вёскі Катынь у Смаленскай вобласці, Асташкаўскім у Цвярской вобласці) і адным — ва Украіне (Старабельскім на ўскраіне Харкава). Акрамя таго, у турмах заходніх абласцей Украіны і Беларусі былі расстраляны 7305 афіцэраў польскай арміі. Паколькі Служба бяспекі Украіны перадала польскаму боку звесткі аб 3435 забітых, то мінімальная колькасць расстраляных афіцэраў польскай арміі на тэрыторыі Беларусі складае 3870 чалавек",* — сказаў І.Кузняцоў.

Паколькі, паводле яго слоў, беларускі бок не прадставіў Польшчы гэтыя звесткі, дагэтуль застаюцца нявысветленымі месцы гібелі афіцэраў польскай арміі, расстраляных на тэрыторыі Беларусі. *"Дарэчы, міжнародны "Мемарыял" пакуль так і не дабіўся ад уладаў Расіі прызнання знішчаных афіцэраў ахвярамі палітычных рэпрэсій",* — падкрэсліў І.Кузняцоў.

Паводле яго слоў, беларускія члены "Мемарыяла" сумесна са сваімі расійскімі калегамі і ўпаўнаважаным па правах чалавека Расіі Уладзімірам Лукіным будуць звяртацца ў КДБ Беларусі з запытам аб магчымым устанаўленні месцаў гібелі афіцэраў польскай арміі, расстраляных у Беларусі.

Марат ГАРАВЫ.

К 2050 году население Беларуси сократится почти на треть

Организация Объединенных Наций представила новый доклад о перспективах роста населения в мире. Согласно этому документу, население Беларуси в ближайшие 43 года сократится на 28,2%, и к 2050 году составит 6,96 миллиона человек. По темпам вымирания населения наша страна занимает "почетное" пятое место в мире.

Помимо этого население Беларуси стареет. И если в 1950 году средний возраст жителей нашей страны составлял 27,2 года, то в 2005 году он увеличился уже до 37,4 года. А к 2050 году средний возраст белорусов составит 49,6 лет.

Соб.инф.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 САКАВІКА 2007 г.

Венгерский «коктейль»

В Венгрии вновь прошли выступления против правительства и возникли беспорядки

В чем же глубинные причины происходящего? Вот какой ответ на этот вопрос дал специалист по странам Центральной Европы Ярослав Шимов по Радио Свобода.

— В Венгрии есть существенные экономические проблемы, в частности, крупный, выбивающийся за все рамки ЕС дефицит бюджета. Экономический рост, как и во всем этом регионе, довольно солиден. Но тем не менее значительна и безработица, есть и определенные региональные различия.

Есть и чисто политические причины — давнее противостояние правых и левых сил, характерное для Венгрии. В этих протестах сошлось все воедино. Дополнительным раздражителем является личность самого премьера Ференца Дюрчаня — это бывший комсомольский активист, ставший миллионером, успешный предприниматель, человек, часто ведущий себя экстравагантно, очень многим, в том числе и националистам, не нравящийся. Говорят, что у него есть некие еврейские корни. В Венгрии эта тема всегда была болезненной для националистов. Все эти факторы — социально-экономические, политические, субъективные — и составляют этот коктейль, который приводит в итоге к массовым выступлениям и беспорядкам.

О ВАЖНОМ

Преимущества расширения НАТО

Воинственная речь президента России Владимира Путина на Мюнхенской конференции по безопасности заставила некоторых вернуться к своим доводам против расширения НАТО. Это было неблагоразумно и привело к той национальной политике, которая сейчас исходит от Москвы, говорят они. Расширение НАТО было плохой идеей, настаивают они, так как оно вызвало гнев России и заставило россиян выбрать президентом бывшего офицера КГБ и ветерана холодной войны. Единственное, что мы получили от расширения НАТО, говорят они, это чешский флот.

Критики заблуждались, когда возражали против приема в Североатлантический альянс новых членов в 1990-х годах, и они продолжают заблуждаться сейчас. На деле, чем больше проходит времени, тем убедительнее выглядят доводы за расширение. Основных аргументов за расширение НАТО было три, и каждый из них оказался справедливым.

Во-первых, расширение НАТО было призвано обеспечить щит безопасности, за которым страны Центральной и Восточной Европы могли бы похоронить свои старые конфликты и мирно интегрироваться с Западом. Взяв на себя роль руководителя расширения, НАТО способствовало и расширению Евросоюза. В результате Европа стала наиболее демократичной, мирной и безопасной, чем когда-либо. Выиграли от этого все — американцы, европейцы, русские. Угроза, которую сейчас ощущает Россия, исходит не с запада, а с юга и востока. Действительно, для Москвы западные границы сейчас более безопасны и надежны, чем когда бы то ни было со времен Наполеона.

Во-вторых, расширенное НАТО является страховкой от того, что Россия с течением времени может снова стать региональным пугалом или угрозой. Именно такая опасность сейчас просматривается, однако для стран Центральной Европы есть хорошая новость: теперь, вступив в ЕС и НАТО, они в безопасности. Вообразите себе, что сейчас представляла бы собой Центральная Европа, если бы альянс оставался в прежних рамках: главы стран Центральной и Восточной Европы уделяли бы больше времени попыткам устоять под давлением России, чем созданию демократических институтов и управлению жизнеспособной экономикой свободного рынка. Отношения с Польшей и странами Балтии были бы похожи на те проблемные отношения, которые сейчас связывают Россию с Украиной и Грузией. У нас снова была бы нестабильность в сердце Европы, причем в тот момент, когда нам это нужно меньше всего.

Третья причина для расширения НАТО была стратегической и более масштабной. В тот момент президент США Билл Клинтон говорил о желании помочь Европе разрешить внутриконтинентальные конфликты и о своих надеждах, что это поможет европейцам расширить геополитические перспективы и взять на себя больше ответственности, став партнерами США в борьбе с угрозами за пределами Европы. Неужели кто-то сомневается, что именно в этом возникла потребность после 11 сентября 2001 года? Разве были бы сегодня войска НАТО в Афганистане и разве шла бы речь о более глобальных миссиях, если бы мы не помогли создать стабильную систему безопасности после холодной войны в Европе?

Говорить, что расширение НАТО спровоцировало избрание Путина в президенты, значит переписывать историю. Что касается карьеры Владимира Путина, то нам надо благодарить за это Бориса Ельцина. Он выбрал Путина своим преемником, чтобы защитить собственные интересы, то есть причины, которыми он руководствовался, не имели к расширению НАТО ни малейшего отношения. Давайте не будем больше притворяться, что тревожное возникновение России в качестве нелиберального и все более авторитарного государства, растущего из евразийского нефтяного национализма, является результатом западной политики. Это связано с происходящим внутри России, и Запад практически не в состоянии контролировать там ситуацию.

Мечта о вступлении в НАТО и возвращении в европейскую семью объединила людей и помогла им плечом к плечу выступить в поддержку серьезных реформ, которые были успешно осуществлены только потому, что они являлись ценой вступления в НАТО. И сегодня у них есть необходимая уверенность и ресурсы для противостояния растущему национализму России.

По существу, благодаря расширению НАТО мы получили гораздо больше, чем чешский флот. Мы получили объединенную и свободную Европу. Мы получили альянс, который лучше приспособлен к тому, чтобы защищать нас от угроз будущего, — как раз потому, что мы похоронили столько призраков прошлого. Это довольно удачная сделка.

Грег КРЕЙГ,
Роналд АСМУС.
The Washington Post.

Авторы статьи работали в Госдепартаменте США при администрации Билла Клинтона. Крег Грейг был главой отдела политического планирования, а Роналд Асмус — заместителем помощника госсекретаря по европейской политике.

ФОТООКНО

Конкурс красоты

В Сочи прошел Международный конкурс красоты среди замужних женщин.

Этот город был выбран как место проведения конкурса не случайно — организатор "Миссис мира" Дэвид Мармел поддерживает Сочи в качестве кандидата на право принять зимнюю Олимпиаду в 2014 году. В конкурсе принимали участие 30 самых красивых женщин мира, в частности, из Венесуэлы, Боливии, Кипра, Гватемалы, Канады, Франции, США, Германии, Индии, Китая, Канады, России, Беларуси, Украины, Нигерии. Победительницей стала "Миссис Америка" — Диана Такер. Диане Такер 29 лет. Она менеджер по профессии. В браке состоит 5 лет. Муж — 50-летний пожарный.

КОРОТКО

Впервые без благословения

Туркмены впервые вышли на посевную без благословения президента.

В Туркменистане стартовало одно из важнейших сельскохозяйственных мероприятий — сев хлопчатника. Впервые за 15 лет независимости посевная проходит без благословения главы государства. Раньше первый президент Туркменистана Сапармурат Ниязов торжественно объезжал регионы и благословлял сев, бросая горсть семян в поле.

Публичные извинения за ошибку в прогнозе начала цветения сакуры

Главный метеоролог Японии Кейчи Кашиваги в эфире национальных новостей принес публичные извинения за ошибку в прогнозе начала цветения сакуры в Токио, сообщает агентство France Presse.

По информации агентства, ранее из-за компьютерной ошибки было объявлено, что сакура в Токио распустится не 21, а 18 марта. Японская метеорологическая служба также пересмотрела даты начала цветения в трех других районах Японии, отложив начало этого сезона на сроки до 9 дней.

Прогнозирование начала цветения японской вишни является одной из самых ответственных задач метеорологической службы Японии после предсказания землетрясений. Ежегодный период цветения сакуры длится менее недели и в это время жители Японии любят выбираться в парки, дворы для того, чтобы провести время под деревьями.

После США и Китая

Индия занимает третье место в мире по объемам телекоммуникационной сети, уступая только США и Китаю, говорится в докладе, обнародованном Министерством связи и информационных технологий.

Согласно данным доклада, только за февраль 2007 года число пользователей мобильных телефонов увеличилось на 6,3 миллиона человек . Наиболее серьезный прирост пользователей зафиксирован для беспроводных средств связи.

По данным компании Comscore Networks, по итогам 2006 года Индия заняла восьмое место по количеству интернет-пользователей, обогнав Канаду, Италию, Бразилию, Испанию, Россию, и имеет самую динамичную тенденцию к дальнейшему развитию в этой области — порядка 10% в год.

ИНТЕРЕСНО

Развод по-русски,

или Как ему удалось сколотить такое состояние, которому может позавидовать британская королева?

Живущий в Великобритании известный российский олигарх, губернатор Чукотки Роман Абрамович развелся с женой Ириной. Об этом сообщил официальный представитель бизнесмена Джон Манн. "Господин и госпожа Абрамовичи совершили развод в России по взаимному согласию", — говорится в распространенном заявлении. Манн также отметил, что паре удалось договориться о воспитании детей и разделе имущества, передает РИА "Новости". При этом он особо подчеркнул, что деловые интересы Абрамовича не будут затронуты. В частности, футбольному клубу "Челси", которым владеет российский губернатор, ничего не грозит.

Казалось бы, что здесь особенного? Но многие СМИ уделили внимание этому событию. Они и ранее, как только заподозрилось в его семье неладное, живо откликались по каждому поводу. Внимание прессы привлекает сама фигура, личность самого богатого российского олигарха.

Это расставание обещало стать самым дорогим в истории бракоразводных процессов. По данным The Daily Mirror, теперь уже бывшая жена чукотского губернатора Ирина имела право рассчитывать на рекордные алименты. По британским законам супруга при разводе претендует на половину капитала мужа. А состояние Абрамовича оценивается почти в 19 млрд долларов. Однако брак расторгнут в России, по российскому законодательству с учетом мирового соглашения. Финансовая сторона вопроса пока остается закрытой.

Но вот капиталы Романа Абрамовича продолжают волновать комментаторов. СМИ пишут, что его состоянию может позавидовать даже британская королева.

С 2004 года Абрамович начал избавляться от бизнеса в России, вкладывая вырученные средства в заграничную недвижимость. Крупнейшим его приобретением стал футбольный клуб "Челси", за который он заплатил 270 миллионов долларов. Впоследствии еще сотни миллионов долларов были потрачены на покупку звездных игроков. Кроме того, Абрамовичу принадлежит поместье Файнинг-Хилл в графстве Западный Суссекс стоимостью 18 миллионов фунтов, а также недвижимость в Лондоне на 50 миллионов фунтов, включая пентхаус в районе Кенсингтон и пятиэтажный дом в районе Белгравия.

Во Франции российский миллиардер владеет поместьем Шато де ла Кро, ранее принадлежавшим герцогам Виндзорским, и домом в курортном городе Сен-Тропе на Лазурном берегу.

В распоряжении Абрамовича имеется солидный флот яхт, в том числе "Пелорус" стоимостью 72 миллиона фунтов с собственной подводной лодкой. Во столько же оценивается яхта "Экстасея". Чуть дешевле (60 миллионов фунтов) стоит "Гран-Блу", оборудованная вертолетной площадкой. Кроме того, Абрамович строит еще одну яхту за 100 миллионов фунтов.

У миллиардера имеется и воздушный флот, который включает Boeing-767, еще один "Боинг" бизнес-класса и два вертолета. Общая стоимость частной авиации Абрамовича составляет 120 миллионов фунтов. На фоне этого мелочью кажутся два самых дорогих автомобиля в мире Maybach-62, выполненные по индивидуальному заказу и обошедшиеся владельцу "Челси" всего в миллион фунтов.

Всего, по некоторым оценкам, расходы Абрамовича на недвижимость и транспортные средства с 2001-го по 2005 год составили около 1,24 миллиарда долларов.

Как же ему удалось сколотить такое состояние?

Говорят, Абрамович разбогател на волне российской приватизации-"прихватизации" благодаря своевременным знакомствам с влиятельными политиками и бизнесменами.

В статье, опубликованной на сайте АПН, говорится, что он стал образцом новорусского большого успеха. Для которого не нужны, в общем, ни образование, ни ум, ни талант, ни даже упорный труд. Нужно только одно — оказаться в нужное время в нужном месте и схватить свой таинственный шанс. Человек очень средних способностей, зато вовремя научившийся мариновать шашлыки на временной даче ельцинского "полусына" Валентина Юмашева, показал России ее недоуменное место: вынес из Родины миллиарды долларов. Это ли не триумф, на котором должно воспитаться следующее поколение маленьких интернет-абрамовичей?

Его называли "зачуханным" женщины. Он не смог толком окончить ни один вуз. А теперь ему завидуют миллионы. Влиятельная "FINANCIAL TIMES" замечает, что имеющий, подобно многим хозяевам корпораций, еврейские корни, Абрамович вырос в детском доме, где, по мнению некоторых, у него развились огромные личные амбиции. Пользуясь покровительством Березовского, он установил дружеские связи с семьей Ельцина, особенно с его дочерью Татьяной. По утверждению Бориса Немцова, Абрамович великолепно готовил для нее шашлыки.

К этому времени он уже имел какой-то бизнес. Свой первый кооператив "Уют", официальная деятельность которого заключалась в производстве игрушек из полимерных материалов, организовал еще в студенческие годы. Партнеры Абрамовича по "Уюту" Евгений Швидлер и Валерий Ойф впоследствии составили управляющее звено "Сибнефти".

В начале 1990-х — учредитель фирм: АО "Меконг", ИЧП "Фирма "Супертехнология-Шишмарев", АОЗТ "Элита", АОЗТ "Петролтранс", АОЗТ "ГИД", "НПР" и многих других.

19 июня 1992 года Роман Абрамович в Москве был заключен под стражу в порядке ст. 90 УПК РФ по подозрению в совершении хищения 55 вагонов с дизельным топливом с государственного Ухтинского нефтеперерабатывающего завода на сумму около 4 миллионов рублей. Согласно материалам следствия, малое предприятие "АВК", которым руководил Абрамович, овладело топливом по подложным документам. Скрепляя подписью чистосердечные показания, Абрамович собственноручно сделал в протокол приписку: "Хочу добавить, что я как директор "АВК" готов возместить ущерб, причиненный моим предприятием государству". Впоследствии расследование дела было "заморожено".

В 1993 году Роман Абрамович продолжил коммерческую деятельность, в частности, по продаже нефти из города Ноябрьска. Фирма Абрамовича АР "Меконг" занимала второе место после "Балкар трейдинг" по объему продажи нефти из этого города. По некоторым данным, этим Абрамович был обязан знакомству с Андреем Городиловым, сыном главы "Ноябрьскнефтегаза" и первого президента "Сибнефти". Говорят, примерно в то же время Роман Абрамович познакомился на Карибских островах с Борисом Березовским. Там они оказались по приглашению руководителей "Альфа-банка" Петра Авена и Михаила Фридмана. Березовского позвал Авен (они были знакомы по работе в "ЛогоВАЗе"), а Абрамовича — Фридман.

На паях с Борисом Березовским Романом Абрамовичем была создана оффшорная фирма Runicom Ltd, зарегистрированная в Гибралтаре, и пять ее "дочек" в Западной Европе. В 1993—1996 годах Роман Абрамович возглавлял Московское представительство компании Runicom S.A., зарегистрированной в Швейцарии.

В большой бизнес Роман Абрамович вышел благодаря именно Борису Березовскому. Абрамович учредил десяток фирм, которые использовал вместе с Березовским для приобретения акций "Сибнефти". Березовский в долгу не остался и во времена нахождения на политическом олимпе России пролоббировал интересы Абрамовича, которого в свое время называли "кошельком семьи Ельцина". Связи обоих с этой семьей, говорят, и стали для них площадкой для "прихватизации".

На "личном фронте" было так. Роман Абрамович и Ирина Маландина познакомились в начале девяностых. Он был начинающим бизнесменом, она — стюардессой. В браке у них родилось пятеро детей. В 2003 году семья переехала в Лондон, уточняет НТВ. Позже там возникли трения. Как пишет лондонская пресса, последней каплей, вконец испортившей отношения между супругами, стали слухи о романе Абрамовича с 23-летней моделью Дарьей Жуковой, бывшей подругой теннисиста Марата Сафина. Дарья — дочь крупного российского бизнесмена, также проживающего в Лондоне.

Романа несколько раз видели с Дарьей на футбольных матчах "Челси", которые перестала посещать Ирина. По слухам, он также несколько раз летал с нею на своем самолете на романтические вечеринки. Существование отношений между Романом и Дарьей подтвердил официальный представитель Абрамовича Джон Манн, по словам которого "она одна из многих знакомых", которых миллиардер приглашает на свой стадион". При этом Манн уточнил, что речь идет о частной жизни, в связи с чем отказался от дальнейших комментариев.

Об Абрамовиче пишут много и разное. А вот сам Абрамович не многословен. Он практически не дает интервью. Вот и после развода

Роман и Ирина отказались от комментариев, заявив, что "это их частная жизнь".

По материалам прессы.

УКРАИНА

Новый «сюрприз» Чернобыля

Чернобыль готовит Украине новую угрозу — отравленную воду на 300 лет вперед и радиационные облака до середины нынешнего века.
Такой мрачный прогноз дают специалисты зоны отчуждения вокруг Чернобыльской АЭС, сообщил Пятый телеканал.

Главную опасность представляет не дырявый "саркофаг" над разрушенным четвертым реактором АЭС, как это принято считать, а пожары радиоактивного леса в 30-километровой зоне, непрочная дамба на Припяти и разрушенные хранилища зараженных отходов и техники. На этих объектах излучение в несколько раз превышает уровень на самой станции.

Как сообщил представитель АЭС Николай Тетерин, "из саркофага в среднем за год уходит 0,05 кюри радионуклидов — это большая величина, но вынос по воде составляет от 70 до 100 кюри в год. Вскоре все колодцы с питьевой водой в Киевской области будут отравлены на 300 лет вперед".

Бороться с приближающейся катастрофой некому и не на что, отмечает телеканал. Число работников в зоне отчуждения с каждым годом уменьшается из-за перебоев с финансированием.

В последние годы из зоны отчуждения вокруг ЧАЭС увеличился несанкционированный вывоз древесины, металлолома, брошенного имущества. На рынках встречаются случаи торговли радиоактивными фруктами, ягодами, овощами и рыбой, передает ИТАР-ТАСС.

КИТАЙ

Социализм с... частной собственностью?

Всекитайское собрание народных представителей (ВСНП) приняло закон, вводящий равную защиту государственной и частной собственности, сообщает агентство Xinhua.
На одобрение закона, который разрабатывался 13 лет и прошел целых семь чтений, почти трем тысячам депутатов потребовалось меньше минуты.

В 247-статейном документе, который вступает в силу с 1 октября 2007 года, говорится, что "собственность государства, коллектива, гражданина и других участников отношений охраняется законом и никакие организации или граждане не могут посягать на нее".

По словам заместителя главы законодательного комитета ВСНП, новый закон защищает установленный порядок социалистической рыночной экономики. До этого в марте 2004 года ВСНП приняло поправку к конституции Китая, которая делала частную собственность, полученную законным путем, неприкосновенной.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 САКАВІКА 2007 г.

НЯВЫДУМАНАЯ ГІСТОРЫЯ

Вяртанне бабулькі Настассі,

або Аб людской дабрыні і жорсткасці

Познім лютаўскім вечарам у доме старшыні Мяляхавіцкага сельскага Савета **Вячаслава Халопіка** зазваніў тэлефон. Міжгародні. Частыя гудкі падаліся яму трывожнымі. Зняў трубку і пачуў жаночы голас, напоўнены слязамі і смуткам:

— *Вячаслаў Аляксандравіч, даруйце за позні званок. Я дачка Настассі Іванаўны Антончык. Яна жыла ў вашым сельсавеце, усё жыццё працавала ў мясцовым калгасе. Ведаеце ж, што гадоў з дзесяць таму мы забралі сваю старэнькую маму да сябе ў горад Сургут, што ў Цюменскай вобласці. А цяпер наша мамачка памерла, і мы вязём яе на радзіму, каб пахаваць...* — голас жанчыны перапынілі слёзы, а Вячаслаў Аляксандравіч стаяў ля тэлефона, уражаны да глыбіні душы: гэта ж падумаць — дочкі вязуць маму ў такую далечыню, каб даць ёй вечны спачын у роднай зямельцы. Далёка не ўсякія дзеці здольны на такое...

Жанчына справілася са слязамі і прадоўжыла далей:

— *Мы вельмі просім вас, Вячаслаў Аляксандравіч, дапамажыце ў арганізацыі пахавання: каб людзі выкапалі магілу, машына патрэбна завезці труну на могілкі... Ды і хочацца, каб яна колькі гадзін пастаяла ў хаце, а там не прыбрана, бо даўно ж ніхто не жыве...*

— *А вы дзе цяпер?* — спытаў старшыня.

— *У Маскву толькі што прыехалі. Мы дабіраемся цягнікам. Едзем усе пяцёра сясцёр. А труну з целам маці вязе мікрааўтобус. Так што і не ведаем, хто першы дабярэцца да месца. Такая ж далечыня!*

— *Прыміце мае шчырыя спачуванні і не хвалюйцеся наконт пахавання: мы ўсё тут зробім як трэба...*

Вячаслаў Аляксандравіч паклаў трубку і доўга сядзеў у задуменні. Ён ведаў сям'ю Антончыкаў з вёскі Белагурына. Пяць дачок, праўда, не вельмі, бо яны ўжо даўно жылі далёка ад радзімы, а вось бацькоў ведаў. Гэта былі сціплыя і працавітыя людзі з вельмі няпростым лёсам. Некалі ў маладога вяскоўца памерла жонка, пакінуўшы чацвёра дзетак. Праз некаторы час нечакана для ўсіх ён ажаніўся з маладой і прывабнай Настассяй. Дзяўчына згадзілася замяніць маму чатыром сіротам. А потым і свае дзеткі пайшлі: пяцёра дзяўчынак нарадзіла Настасся Іванаўна.

З цягам часу старэйшыя памалу ўладкавалі сваё асабістае жыццё, а потым і малодшыя дзяўчынкі адна за адной падаліся ў вялікі свет шукаць лепшай долі. Жылі ў Сярэдняй Азіі, а потым пераехалі ў Сургут. Працавітыя, дружныя.

...Назаўтра цэлы дзень Вячаслаў Аляксандравіч займаўся арганізацыяй пахавання дзевяностагадовай бабулькі Настассі. Месца на могілках падабраў акурат там, дзе ўжо шмат гадоў пакоіўся прах яе брата і іншай радні. Знайшоў людзей, каб выкапалі магілу. Труну з целам нябожчыцы вырашыў не заносіць у невялічкую кватэру на другім паверсе, а паставіць яе ў калгасным Доме культуры. Заслужыла бабулька Настасся. Што там казаць.

Займаўся рознымі клопатамі і ўсё назіраў, можа, з'явіцца на вясковай вуліцы мікрааўтобус з расійскімі нумарамі ці, можа, першымі прыедуць асірацелыя дочкі Настассі Іванаўны? Так і не дачакаўшыся, познім вечарам пайшоў дадому.

Ноччу не спалася. Доўга абмяркоўвалі гэту неардынарную падзею з жонкай Марыяй, захапляючыся высакароднасцю Антончыкавых дачок: дзе той Сургут і дзе Белагурна, а вязуць маму ў родную зямельку...

Яшчэ цёмна было, калі ён пайшоў са сваёй вёскі Харашкі ў Белагурыну. Ноччу выскачыў добры мароз, і Вячаслаў Аляксандравіч клапаціўся, як там дочкі Антончыкаў, ці не замерзлі? Бо за гэты час павінны былі прыехаць. Ці дабраўся да месца мікрааўтобус?..

Прыйшоў, і да болю зашчыміла сэрца. Сёстры ўжо прыехалі, адамкнулі кватэру, а ў ёй холадна, як у лядоўні: за столькі гадоў, што не жылі, нешта зрабілася з абаграваннем. Ён хутка знайшоў два электраабагравальнікі, каб жанчыны адагрэліся з дарогі. Пачаставаць сясцёр гарачай стравай не мог, бо дом яго далёка, а тут, у Белагурына, сталовай няма. Аднаго не мог зразумець добры і спагадлівы Вячаслаў Аляксандравіч, як жа забітых горам, змучаных такой далёкай дарогай кабет не сустрэла іх зводная сястра, якая разам з мужам і дачкой жыве ў гэтай жа вёсцы? Ведалі ж пра пахаванне, але не выйшлі, каб сустрэць радню, абагрэць яе, накарміць, выказаць спачуванні...

Нарэшце прыехаў мікрааўтобус з труной. Яе, як і належыць, паставілі ў Дом культуры. Ад калгаса, дзе бабулька Настасся адпрацавала столькі гадоў, прынеслі вянок. Вячаслаў Аляксандравіч прывёз праваслаўнага святара, каб адслужыў жалобную малітву. Прыйшлі некаторыя вяскоўцы развітацца з нябожчыцай. І калі святар вымаліў апошнія словы малітвы, дзверы адчыніліся і ў памяшканне ўвайшла падчарыца са сваёй сям'ёй. Прынеслі жалобны вянок. Але ў час пахавання яны не жалобу выказалі сёстрам з Сургута, а сваё нейкае недарэчнае і незразумелае абурэнне:

— *І трэба ж было перці дзевяностагадовую старую ў такую далечыню, траціць вялікія грошы... Маглі б і там закапаць. Усё роўна зямля...*

Не ўсё роўна! Родная зямелька нават на труне лёгкая. Ды бабулька Настасся і не давала дочкам такога запавету: пахавайце мяне на радзіме. Ведала, што радзіма тая, як кажуць, за светам, грошай шмат трэба, што дочкі яе ўжо самі немаладыя... Але калі зусім занемагла і пачула блізкую смерць, не раз казала:

— *Вось каб мне каля брата легчы ў родную зямельку ды каля ўсёй радні... Але ж не выпадае...*

Разумныя і спагадлівыя дочкі сэрцам адчулі мацярынскую жальбу па роднай старонцы, яе жаданне хоць пасля смерці вярнуцца туды. Як памерла, без лішніх размоў склаліся па тысячы долараў, атрымалася пять. Гэтых грошай хапіла, каб прывезці маму і па-людску пахаваць там, дзе яна хацела.

Многія жыхары Белагурына адклікнуліся на боль сясцёр Антончык. Нізкі ім паклон за гэта. Але найбольшы цяжар клопатаў узяў на сябе Вячаслаў Халопік — чалавек добры і спагадлівы, сам у жыцці пабачыўшы нямала гора. З пахаваннем бабулькі Настассі яго клопаты і нерватропкі не скончыліся.

— *Вам жа яшчэ належаць ад дзяржавы пэўныя грошы на пахаванне,* — сказаў ён адной з сясцёр Кацярыне. — *Трэба патэлефанаваць у Дзятлаўскі райсабес, а потым паедзем туды.*

Але ў райсабесе яму задалі пытанне, адказу на якое не было:

— *А дзе даведка на пахаванне?*

Аказваецца, сёстрам яе не выдавалі ў Сургуце.

— *Ну, дык пра што мы маем гаварыць?* — спыталі ў райсабесе. -- *Раз няма дакумента, то не будзе і грашовай дапамогі.*

— *Дакумента няма, але ж нябожчык ёсць. Яна ўжо пахавана. Дык што, сёстрам цяпер трэба ехаць у Сургут за паперкай, каб атрымаць якога паўмільёна беларускіх рублёў?* — даводзіў сваё Вячаслаў Аляксандравіч. І такі дамогся справядлівасці: супрацоўнікі райсабеса пазванілі ў сваю вышэйстаячую інстанцыю і грошы былі выплачаны.

— *Няхай іх, з тымі грашыма, неяк абыдземся,* — казалі сёстры.

— *Справядлівасць павінна быць і нейкая логіка,* — прамовіў на гэта Вячаслаў Аляксандравіч.

І вось яшчэ што. Я знарок не называю імён і прозвішчаў мясцовай радні бабулькі Настассі, хоць яны гэтага і заслугоўваюць за сваю жорсткасць. Але ў іх ёсць дзеці і ўнукі, а яны ні ў чым не вінаватыя. Не трэба, каб на іх падаў цень за недастойныя ўчынкі дарослых.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

НАПЯРЭДАДНІ

Падаражэлі пуцёўкі ў Крым

Прыкладна на 15—20% адносна мінулага сезона падаражэюць турпуцёўкі на адпачынак у Крыме.

За апошнія тры гады кошт пражывання ў гасцініцах Крыма вырас у два разы. Калі раней за суткі ў эканамічным нумары са зручнасцямі даводзілася аддаваць 20—24 долары, дык цяпер не менш за 35—40 долараў.

Найперш гэта звязана з тым, што кошты на квіткі за праезд у чыгуначным транспарце ва Украіне выраслі амаль на 48%. Акрамя таго, павысіліся цэны на энерганосьбіты, паліва і асабліва рэзка — на прадукты.

Алег СНОЎ.

РЕКОРД

Дважды в день

Рекордсменом среди автотуристов стал один из жителей Литвы — в 2006 году он более 600 раз побывал в Беларуси. Об этом БЕЛТА сообщил начальник Гродненской региональной таможни Юрий Сенько.

По его словам, каждый раз, возвращаясь домой, литовец вывозил на своем автомобиле не менее 100 л солярки. Таким образом, он вывез из Беларуси как минимум 600 т топлива, приобретенного на гродненских АЗС. Заработал при этом (на разнице цен на топливо в Литве и Беларуси) свыше 12 тысяч долларов.

Несмотря на то, что с 1 марта 2007 года введено ограничение на вывоз топлива за границу с целью перепродажи, по-прежнему каждый пятый в общей очереди автотуристов — литовский бизнесмен, отметил Юрий Сенько.

АБСУРД

Вось дык павіншавалі...

У Адміністрацыі прэзідэнта не ведаюць беларускай мовы?

8 сакавіка па канале "Лад" трансліравалі юбілейны канцэрт вядомага ансамбля народнай музыкі **"Бяседа"**. Беларусь па праву можа ганарыцца гэтым самабытным калектывам! І ў першую чаргу тым, што кожны з яго артыстаў — не проста яркі талент, а шчыры прапагандыст нацыянальнай культуры, народных традыцый і абрадаў. На сцэне — сапраўднае суквецце беларускай зямлі, яе гонар і адметнасць.

У сувязі з 15-гадовым юбілеем ансамбля народнай музыкі "Бяседа" агучвалася адно віншаванне за другім. І ўсе выказвалі артыстам глыбокую ўдзячнасць за чысцюткі ручаёк беларускай песні, які журчыць з іх сэрцаў, напаўняючы радасцю наша жыццё.

Але вось на сцэну паднімаецца намеснік старшыні Белдзяржтэлерадыёкампаніі А.Саламаха і... на рускай мове зачытвае прывітанне ад... кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь сп.Нявыгласа. Чаму не ад А.Лукашэнкі? Пытанне, якое павісла ў паветры. Кожны, хто знаходзіўся ў зале і на сцэне, па-свойму адказаў на яго.

А наконт прывітання спадара Нявыгласа хочацца сказаць наступнае. Калі ў Вас, Генадзь Міхайлавіч, не знайшлося часу самому завітаць на юбілейны канцэрт знакамітага ансамбля народнай музыкі "Бяседа", то не трэба было звяртацца з пісьмовым прывітаннем. Калі Вы, не выключана, не ведаеце беларускай мовы, то няўжо ў Адміністрацыі прэзідэнта не знайшлося чалавека, які валодае родным словам? Вам не ўявіць, якую абразу разам са спадаром Саламахам Вы нанеслі ўсім тым, хто знаходзіўся ў зале і на сцэне! Уласна кажучы, такое недзяржаўнае стаўленне да жамчужыны нацыянальнай культуры (а ансамбль "Бяседа", як і "Харошкі", і Беларускі народны хор М.Дрынеўскага, і шэраг іншых самабытных калектываў з'яўляюцца найкаштоўнейшымі камянямі нацыянальнай спадчыны) — не што іншае, як брыдкі плявок у бок усяго беларускага народа. І каб той жа спадар Саламаха разумеў гэта, то ён знайшоў бы магчымасць выправіць малаадукаванасць тых чыноўнікаў, якія рыхтавалі, адкрыта скажу, абразлівае прывітанне. Вядома ж, сам сп.Нявыглас яго не пісаў.

Што казаць, з такім абсурдам я раней не сустракаўся. А таму і не магу змаўчаць.

А ансамблю народнай музыкі "Бяседа" жадаю далейшай плённай працы на карысць Беларусі, усіх прыхільнікаў нацыянальнай культуры! Каб яго зачароўваючыя канцэрты паказваліся не толькі па канале "Лад", а і па ўсіх астатніх. Дарэчы, я так і не зразумеў, чаму ў той час, калі юбілейны канцэрт ансамбля народнай музыкі "Бяседа" трансліраваўся па канале "Лад", на Першым і АНТ ішлі канцэрты расійскіх калектываў? А ў прынцыпе, што тут не зразумець. Усё зразумела. І тое, што заслужаны беларускі ансамбль не атрымаў прывітання ад беларускага прэзідэнта, і што чыноўнікі рангам ніжэй даслалі яго на чужой мове, і што на каналы з больш масавай аўдыторыяй пусцілі расійскіх спевакоў, а не сваіх, тых, хто праслаўляе нацыянальную культуру — усё гэта не выпадкова. Усё гэта палітыка тых, каго ў народзе называюць манкуртамі.

Максім КАРПЫЗА,
беларус.

СЛЫШАЛИ?

Метрополитен вводит ограничения на количество поездок по проездным

КУП "Минский метрополитен" с 1 апреля нынешнего года вводит лимит на число поездок по проездным билетам многоразового использования на пластиковых карточках с магнитной полосой. Об этом корреспонденту БЕЛТА сообщили на предприятии.

Здесь пояснили, что до настоящего времени число поездок одного пассажира (владельца карточки) по такому многоразовому проездному билету не ограничивалось, так как отсутствовали технические средства регистрации поездок. В связи с проведенной в метро города модернизацией автоматизированной системы контроля оплаты проезда появилась техническая возможность регистрации всех поездок, совершаемых пассажиром по данному проездному билету в течение срока его действия.

Технически возможным стало также установление лимита (ресурса) поездок по данному проездному билету, после израсходования которого билет считается исчерпавшим свой ресурс и более не принимается турникетами, несмотря на то, что срок действия его не истек.

Аргументируя нововведение, собеседники сослались на Инструкцию "О порядке определения стоимости проездных билетов многоразового пользования в городском транспорте общего пользования и автобусах регулярных маршрутов пригородного сообщения" (утверждена Постановлением Министерства экономики, Министерства транспорта и коммуникаций от 16 февраля 2005 года). Данным документом установлено, что при расчете стоимости проездного билета число поездок пассажира в городском транспорте общего пользования Минска должно составлять 120 для месячного проездного и 42 для декадного проездного билета, а фактически пассажир оплачивает по полному тарифу соответственно 44 и 15 поездок.

"Учитывая это, а также значительные убытки метро от семейного (группового) использования проездных билетов, так как по некоторым месячным проездным билетам число поездок превышает 300 в месяц, с 1 апреля в столичном метро вводится лимитирование числа поездок по месячным и декадным проездным билетам", — сказали в КУП "Минский метрополитен".

Таким образом, с 1 апреля пассажир по месячному многоразовому проездному билету на пластиковой карте с магнитной полосой сможет проехать не более 120 раз в течение срока действия, а по декадному — не более 42 раз.

Гісторыкі яднаюцца ў незалежную асацыяцыю

На Беларусі аб'яўлена пра стварэнне новага грамадскага аб'яднання навукоўцаў, якія займаюцца даследаваннем гісторыі палітычных рэпрэсій.

Старшынёй аргкамітэта абрана Ніна Стужынская, кандыдат гістарычных навук, выключаная ў свой час з Інстытута гісторыі. Ініцыятыва належыць гісторыку Ігару Кузняцову.

Апошнімі гадамі з Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук звольнены Генадзь Сагановіч, Андрэй Кіштымаў, Сяргей Тарасаў, Яўген Анішчанка, Ніна Стужынская, Таццяна Процька.

За 12 гадоў найноўшай беларускай гісторыі Вышэйшая атэстацыйная камісія не зацвердзіла ні адной дысертацыі на тэму камуністычных рэпрэсій у краіне. Гэты факт, а таксама цяперашнія рэпрэсіі супраць саміх навукоўцаў і штурхаюць іх на аб'яднанне.

Лілія ВОРАНАВА.

КРЫМІНАЛ

Да выкладчыка — з хабарам

Адразу цэлы шэраг студэнтаў самавольна перавёў з бюджэтнай на платную форму навучання выкладчык аднаго з тэхнікумаў Віцебска.

Пры гэтым студэнты мусілі плаціць не навучальнай установе, а менавіта гэтаму "прадметніку". У выніку пракуратура Кастрычніцкага раёна Віцебска перадала ў суд крымінальную справу аб хабарніцтве, галоўным фігурантам у якой з'яўляецца згаданы педагог.

У абвінаваўчым заключэнні ўказваецца, што выкладчык браў хабар са студэнтаў за паспяховую здачу імі экзамену або заліку. Сведкі (тыя ж студэнты) паказалі, што спярша педагог прапаноўваў навучэнцам прыходзіць да яго на іспыты з выпіўкай і закускай, а потым, адчуўшы смак, прызначыў грашовую таксу або "цвёрды падатак" за станоўчую адзнаку — да 20 тысяч рублёў.

Магчыма, гэтая брудная гісторыя засталася б таямніцай, калі б выкладчык не пачаў дзейнічаць занадта нахабна: браць грошы не толькі з лайдакоў, але і з працавітых і нядрэнна падрыхтаваных студэнтаў. А калі яны выказалі незадаволенасць, хабарнік наўмысна "тапіў" іх на іспытах.

Следства лічыць даказанымі каля 10 фактаў атрымання выкладчыкам хабару, але з улікам таго, што абвінавачваемы працуе ў тэхнікуме з 1989 года, выказваецца меркаванне, што выпадкаў хабарніцтва ў гэтага чалавека магло быць і больш.

Крадзеж з глыбіні стагоддзяў

Неспадзяваную і нялёгкую задачу паставілі перад спецыялістамі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка аператыўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Полацкага гарадскога аддзела ўнутраных спраў. Яны высачылі і затрымалі двух маладых мужчын, якія спрабавалі збыць за 2 тысячы долараў шэраг старажытных рэчаў, здабытых у выніку незаконных раскопак у курганах Верхнядзвінскага і Полацкага раёнаў. За год сваёй крымінальнай дзейнасці "чорныя капальнікі", узброіўшыся даволі грунтоўнымі ведамі па археалогіі і металашукальнікам, аб'ехалі шмат вёсак у пошуку старажытных могільнікаў, адкуль выкапалі амаль 100 каштоўных для навукі і прыватных калекцыянераў прадметаў XII—XIII стагоддзяў. Сярод здабыткаў — фібулы (стражкі) скандынаўскага ўзору, манеты, грыўні, тапор, наканечнік дзіды, бранзалеты, шкляныя каралі, бурштынавая падвеска, пярсцёнак ды іншыя артэфакты сівой мінуўшчыны.

— Цяпер нам трэба вывучыць усё гэта, — гаворыць галоўны захавальнік Полацкага музея-запаведніка Людміла Ластачкіна, — і высветліць, з якіх менавіта курганоў скрадзены канфіскаваныя ў злодзеяў прадметы.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПАЗІЦЫЯ

А дзе ж у вашай улётцы, спадары-таварышы, наш беларускі вольны дух, сама Беларусь?!

Даўно чакаў ад нашай апазіцыі сігналу-тлумачэння таго, што хвалюе, — як у гэтым годзе мяркуецца адзначыць найвялікшае беларускае свята — День Волі 25 сакавіка? За сваркамі-звадкамі паміж партыйнымі лідэрамі нічога пэўнага не праглядалася і не было чутно. Гэта мяне вельмі непакоіла.

Нарэшце, знаходжу ў сваёй паштовай скрынцы лісток — дакладней, цэлую пракламацыю "Зварот да беларускага народу" аж на чатырох старонках. На першай — вялізная чырвоная лічба "25" на белым полі. Схапіў улётку і стаў з нецярплівасцю чытаць... Але чым далей чытаў, тым больш закрадвалася прыкрае пачуццё неразумення, здзіўлення і расчаравання.

Не, усё быццам бы напісана правільна: і пра правал лукашэнкаўскай палітыкі, завязанай на будаўніцтве "саюзнай дзяржавы", і пра згубныя наступствы такога курсу для дзяржбюджэту, прадпрыемстваў і насельніцтва, на які ляжа цяжар росту камунальных плацяжоў. Справядліва адзначаецца, што нам самім з глыбокай эканамічнай прорвы, без зацікаўленай дапамогі звонку — замежных інвестыцый і тэхналогій — ну аніяк не выбрацца. І даволі падрабязна пералічваюцца канкрэтныя прапановы Еўрасаюза наконт супрацы з Беларуссю ў накірунку мадэрнізацыі ў прамысловасці і на транспарце, "паляпшэнні якасці вады, перапрацоўцы адкідаў" і г.д. Не абыдзена ўвагай і гуманітарная сфера — ільготны візавы рэжым, ільготнае крэдытаванне малога і сярэдняга бізнесу, спрыянне навучанню беларускіх студэнтаў за мяжой...

Што ж, канкрэтыка ў накірунках дзейнасці — гэта добра. Усё пералічанае сапраўды закранае жыццёвыя інтарэсы мноства людзей і самой дзяржавы. Хто ж не хоча, каб яна развівалася, квітнела, давала грамадзянам магчымасць зарабіць на еўрапейскі дабрабыт для сябе і сям'і? Такая праграма ў эканамічнай сферы, хоць і далёка не вычарпальная, ды ўсё ж здольная прыцягнуць да сябе ўвагу розных слаёў грамадства. Гэтыя "сакавіцкія тэзісы" выглядаюць бадай што як стратэгія аб'яднаных апазіцыйных сіл на бліжэйшы (і не толькі!) час.

Але што ж мяне так бянтэжыць, непакоіць і нават абурае ў гэтай улётцы?

Абсалютная бездухоўнасць тэксту, дзе няма месца найгалоўнейшым каштоўнасцям кожнага сумленнага грамадзяніна краіны. Нават не згадваюцца нашы святыні — Нацыянальная ідэя, гістарычныя сімвалы — бел-чырвона-белы — Хрыстовы сцяг, герб "Пагоня", з якімі ахвярна ішлі за Волю Бацькаўшчыны многія пакаленні яе сыноў. Нават і не згадваецца, што гэта за дзень такі — 25 сакавіка, чаму ён дарагі патрыётам Беларусі і па якім праве "аб'яднаная апазіцыя" ўзяла на сябе адказнасць перайменаваць найвялікшае наша свята? І адрынуць пры гэтым купалавы покліч "Жыве Беларусь!", што ўвабраў у сябе непахісную любоў, адданасць і веру ў сваю адзіную, незалежную, найдарожшую Маці-Радзіму.

Нічога гэтага, нават намёка на тое ў "аб'яднана-дэмакратычнай" улётцы няма, хоць яна і напісана па-беларуску. Гаворка вядзецца пра нейкае безаблічнае дзяржаўна-тэрытарыяльнае ўтварэнне з гэткімі ж безаблічнымі насельнікамі. Не знаю як хто, а я не хацеў бы жыць у такой — ніякай — дзяржаве, пазбаўленай уласнай самасці, годнасці, непаўторнага аблічча. Такая дзяржава па сутнасці не можа быць незалежнай, яе заўсёды будуць цягнуць то ў бок "двухгаловага арла", то ў бок зорнага еўрапейскага вянка, які ва ўлётцы намаляваны ажно двойчы. Я вельмі паважаю гэты сімвал аб'яднанай дэмакратычнай Еўропы, удзячны ёй за руку падтрымкі. Але ад уласных каранёў, родных сімвалаў адмаўляцца не збіраюся. І дзецям, унукам тое завяшчаю.

Я не хацеў бы жыць у дзяржаве, нават ля перапоўненага ўсімі дабротамі "карыта", з усімі вырашанымі надзённымі праблемамі, у тым ліку — і названымі ва ўлётцы датычна "якасці вады" і "перапрацоўкі адкідаў", калі ў нас па-ранейшаму *ў адкідах* будзе заставацца мая і маіх продкаў душа — мова, падмурак нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, таптацца гістарычная памяць. Калі беларуская моладзь будзе змушана ў масавым парадку ад'язджаць за мяжу на вучобу, а дома ні вучыцца на роднай мове, як і зараз, ні служыць роднай краіне сваімі ведамі і здольнасцямі ёй не будзе як. Калі паранейшаму самае лепшае, дарагое, звязанае з імем Беларусь, будзе кінута ў пыл.

Я хачу жыць у сваім, незалежным Беларускім доме, утульным і цёплым для ўсіх грамадзян, гасцінным і шчодрым для сяброў зблізку і здалёк, як марыў наш вялікі Прарок Купала:

Беларусь на куце
Ў хаце сваёй села,
Чарка мёду ў руцэ,
Пазірае смела...

Дзеля гэтага стаялі насмерць нашы прашчуры цягам доўгіх стагоддзяў. Дзеля гэтага нашы прадзеды ў 1918 годзе стварылі **25 САКАВІКА.** Паспрабуйце адняць у мяне гэтае свята — не атрымаецца!

Не ведаю, каго і чым натхніць гэтая немаведама каму (абывацелям? лукашэнкаўцам? патрыётам?) адрасаваная ўлётка, а я буду ў Дзень Волі з родным бел-чырвона-белым сцягам у руцэ і воклічам "Жыве Беларусь!" на вуснах. Хай не пусцяць мяне амапаўскія полчышчы *на Кастрычніцкую плошчу,* але я буду сэрцам і душой *на Плошчы Кастуся Каліноўскага,* геройскую славу якога годна падхапілі год таму нашы адважныя, светлыя, акрыленыя духам унукі і праўнукі.

Гэтыя маладзёны далі добры ўрок мужнасці і розуму многім, нават дарослым "дзядзькам". Ды не ўсе яго засвоілі. Чытаю на старонках "Народнай волі" павучанні аднаго з вядомых "аб'яднаных дэмакратаў" Віктара Івашкевіча, які выказвае сваю ўпэўненасць: "Перамены на Беларусі без перамоў з уладай немагчымы". І называе тых, хто не верыць у гэта, недальнабачнымі і інфантыльнымі. А сам думаю: хто ж з нас інфантыльны і наіўны? Колькі ні поркаюся ў памяці, ніяк не магу прыпомніць іншай мовы ўлад у "перамовах" з дэмакратамі і народам, акрамя дзічэзнай хлусні, падману, дубінак, рэпрэсій, кратаў. А што добрага далі нам, Беларусі сумнавядомыя перамовы з удзелам "братэрскіх" перамоўшчыкаў Чарнамырдзіна, Строева і Селязнёва або еўрапейца Віка?

Ну, а што зараз атрымалі, "дальнабачныя" вы нашы спадары-таварышы, на свой палымяны аб'яднальніцкі заклік да ўладаў выйсці дружна-поруч на Кастрычніцкую плошчу? Што і трэба было чакаць ад усё яшчэ "кастрычніцкіх" уладаў — ад варот паварот. А яшчэ магчымы і масавы, знаёмы да болю хапун.

І яшчэ скажыце, сп.Івашкевіч: Вы часам не ў курсе, чаму гэта якраз на святочныя сакавіцкія дні апазіцыйныя правадыры так прадбачліва запланавалі "сплавіць" падалей ад Мінска — пад выглядам "вучобы, семінараў", розных "сустрэч" дзесяткі маладых, дэмакратычна настроеных людзей? Можа (не хочацца і дапускаць), за нашай спінай ужо вядуцца з некім нейкія перамовы і дамовы?

І Вы ці такія, як Вы, яшчэ крыўдуеце на З.Пазьняка, які кажа Вам у вочы горкую праўду?

Застаюся верны ідэалам 25 сакавіка і кажу: шчасця вам, родныя, любыя людзі, хто любіць і верыць у Беларусь! З хуткім святам, дарагія суайчыннікі!

З павагай —

Васіль НАВІКОЎСКІ,
грамадзянін
Рэспублікі Беларусь.

ЧУЛІ?

У Мінск прыбыла першая партыя мацы

Першая партыя мацы для іудзейскіх рэлігійных суполак руху ХАБАД дастаўлена ў Мінск з Расіі. 6-тонны гуманітарны груз зараз праходзіць праверкі, у тым ліку Міністэрства аховы здароўя Беларусі.

Пасля гэтага будзе выдадзены дазвол на ўжыванне мацы ў ежу на тэрыторыі нашай краіны. Яе атрымаюць рэлігійныя суполкі ў Бабруйску, Гродне, Магілёве, Брэсце, Гомелі, Кобрыне, Оршы, Барысаве і іншых гарадах.

На працягу гэтага тыдня ў беларускую сталіцу прыбудзе яшчэ 4 тоны гуманітарнага грузу. Дарэчы, ён упершыню дастаўляецца з Расіі, дзе нядаўна пачаў працаваць завод па вытворчасці мацы.

Ул.інф.

Прыватных птушак прышчэпяць

З 12 сакавіка ў краіне пачалася вакцынацыя птушак на ўласных падворках

Плануецца прышчапіць ад птушынага грыпу 2 мільёны кур, качак, гусакоў. Ветэрынарныя службы краіны ўжо назапасілі 2,3 мільёна доз вакцын. А ўлічваючы той факт, што за паўгода на ўласных падворках магло з'явіцца новае пагалоўе птушак, было прынята рашэнне закупіць яшчэ не менш як 5 мільёнаў доз вакцын.

Вакцынацыя адбудзецца напярэдадні міграцыі дзікіх птушак — галоўных пераносчыкаў страшнай хваробы. Таксама ў гэты час прыватным асобам забаронена прадаваць на рынках краіны жывых птушак. Вясенні продаж куранят дазволены толькі птушкафабрыкам і толькі ў спецыяльных месцах.

Алеся КОВАЧ.

РЭГІСТРАТУРА

Ад туберкулёзу будуць лячыць прымусова

"У апошнія гады ў Беларусі актывізавана сістэма лячэння туберкулёзу, — заявіў 20 сакавіка падчас сустрэчы з журналістамі начальнік Упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Ігар Броўка. Спецыяліст удакладніў, што ў рэспубліканскім НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі ўжо створана 100 месц для прымусовага лячэння такіх хворых.

Вырашаць каго лячыць прымусова ад туберкулёзу будзе суд, а не медыкі. Таму адмова ад лячэння будзе лічыцца прававым парушэннем, за невыкананне якога чалавека могуць прыцягнуць да адказнасці.

Дарэчы, захворванне туберкулёзам па-ранейшаму застаецца сур'ёзнай праблемай у Беларусі. Па словах Ігара Броўкі, толькі ў мінулым годзе туберкулёзам захварэла больш за 5 тысяч чалавек, сярод якіх 30 дзяцей.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

МЕДСПРАВКА

Отечественные лекарства потеснят импортные?

Лекарственный рынок страны меняет свою структуру. Правительство поручило белорусским производителям фармацевтической продукции разработать и наладить выпуск около 200 новых наименований таблеток и микстур. К 2010 году на территории Беларуси должно быть зарегистрировано 700 наименований отечественных лекарственных препаратов. Для сравнения, в 1992 году белорусских таблеток на нашем рынке было всего лишь 100 наименований. "Практически вся деятельность фармакологической службы страны направлена на то, чтобы обеспечить жителей Беларуси дешевыми, доступными и качественными лекарственными препаратами", — говорит заместитель председателя концерна "Белбиофарм" Петр Мандрукевич.

Правительство просит таблеток

Верят ли сами представители фармацевтической отрасли в то, что говорят, неизвестно. Но надежду на то, что к 2010 году в Беларуси будет делаться много таблеток хороших и разных и при этом по доступным ценам, высказывают все.

В основном наши производители будут осваивать выпуск дженериков — аналогов известных зарубежных лекарств, которые успешно продаются в мире как минимум последние 20 лет. Подсчитано, что на разработку и испытание оригинального препарата требуется не менее 6 лет и 100—200 тысяч долларов. Зарубежные кампании вкладывают в такое предприятие значительно большие средства — до 2 млрд долларов в производство одного препарата. А за счет выпуска дженериков удается сэкономить миллионы долларов: производители уже не тратят средства на разработку препарата и его испытание. Кроме того, наладив выпуск дженериков, не надо искать валюту на закупку большого количества зарубежных оригиналов, как правило, стоящих немало.

Белорусские лекарства в несколько раз дешевле своих аналогов, а значит, доступны прежде всего малообеспеченным гражданам. По словам Петра Мандрукевича, до 90 процентов отечественных таблеток и микстур стоят не более 2 долларов за упаковку. Заместитель начальника научно-фармацевтического центра РУП "Белмедпрепараты" **Татьяна Трухачева** приводит такие цифры: *"Если бы то, что разработано нашим НФЦ за последние 5 лет, было закуплено за рубежом, пришлось бы потратить 30 миллионов долларов"*.

Но надо ли фармакологической отрасли страны осваивать выпуск такого количества лекарственных средств? Ни одна страна с развитой фармацевтической промышленностью не выпускает более 60% известных лекарств, некоторые европейские страны поставляют на внутренний рынок 10—20% лекарств собственного производства. Возникает и другой вопрос: как низкая цена таблеток соотносится с их качеством? *"О том, что белорусские лекарственные средства качественные,* — поясняет Петр Мандрукевич, — *говорит тот факт, что процент забраковки отечественных препаратов самый низкий из всех, которые поставляются на наш рынок. Он составляет менее 0,1 процента"*.

Однако в США, например, для того чтобы облегчить выбор качественных дженериков, существует специальная их классификация — тем препаратам, которые уступают оригиналу, присваивается класс "B". Это говорит о более низкой эффективности таблеток и большом числе побочных эффектов. В Беларуси такой базы данных нет. И медики, выбирая между ценой и качеством, вынуждены руководствоваться своим личным опытом. Но как правило, выписывая льготный рецепт, они отдают предпочтение отечественным лекарствам. К слову, к 2010 году в перечне социально значимых и жизненно необходимых лекарств доля отечественных препаратов должна составить 50% против 37%, которые есть сегодня.

И последнее. Не приведет ли политика импортозамещения лекарств к тому, что из наших аптек исчезнут зарубежные препараты? Не будем ли мы, как в былые времена, ездить за таблетками и витаминами в Москву или в страны дальнего зарубежья? *"Выбор у белорусов будет всегда,* — заверяет первый заместитель министра здравоохранения **Роберт Часнойть**. — *Хотя замечу — потребитель всегда выбирает препараты, которые качественны и стоят недорого. Практика показала: как только в стране появляются качественные аналоги, они вытесняют импортные препараты. Да и фирмам, поставляющим их в Республику Беларусь, становится невыгодно у нас торговать"*.

Все за GMP

Смогут ли белорусские фармацевтические заводы выполнить то, чего требует правительство? Сегодня в стране сложилась такая ценовая политика, что заводы выпускают некоторые лекарства себе в убыток. Например, димедрол, новокаин, эуфиллин и другие. Но и отказаться от их производства не имеют права. Государство, правда, обещает поддержку. Из госбюджета в течение пяти лет планируется выделить на разработку и выпуск новых лекарственных средств 40 млрд рублей. В период с 2001-го по 2006 год эта сумма была значительно скромнее — 11 миллиардов. Кроме того запланирована реконструкция крупнейших фармацевтических заводов страны — минского РУП "Белмедпрепараты", Борисовского завода медицинских препаратов, а также минского "Минскинтеркапс" и Дрогичинского завода "Экзон".

Сегодня в Беларуси ни один из государственных фармацевтических заводов не соответствует международным требованиям GMP. А без этого невозможно производить лекарства, соответствующие мировым стандартам, а значит, продаваемые за рубежом. Запланированная реконструкция заводов как раз-то и должна решить эту проблему. По словам Петра Мандрукевича, уже создана национальная программа по переходу предприятий на стандарты GMP, разработана нормативно-техническая документация, осталось только главное — решить вопрос с финансированием. Сами заводы из-за низкой рентабельности не имеют денег на перевооружение.

"Борисовский завод медицинских препаратов — одно из крупнейших фармацевтических предприятий страны, — признается директор завода **Александр Фандо.** — *Мы ориентированы на качество. Как результат половина нашей продукции идет на экспорт. Перед нами стоит цель аттестоваться по системе GMP, для чего мы вкладываем средства в реконструкцию производства. Выпуская лекарственные средства за минимальную цену и не имея возможности ее увеличить, терпим убытки. А ведь для полного приведения нашего производства к международным стандартам нам нужны десятки миллионов долларов, которыми предприятие не располагает"*.

Заместитель начальника НФЦ РУП "Белмедпрепараты" Татьяна Трухачева признается, что на реконструкцию их предприятия потребуется не менее 45 миллионов долларов.

"Мы намерены привлечь собственные деньги, а также кредиты банков и иностранных инвесторов в размере 300 миллиардов белорусских рублей, — поясняет заместитель председателя концерна "Белбиофарм" Петр Мандрукевич. — *За эту пятилетку отрасль должна на 90% произвести техперевооружение, чтобы все производства соответствовали тем требованиям, которые допускают реализацию лекарственных препаратов на европейском рынке"*.

К слову, сегодня Беларусь экспортирует до 40 процентов выпускаемых в стране лекарственных препаратов. Белорусские таблетки пользуются спросов в основном в странах СНГ. Постоянные импортеры наших лекарств — Россия, Казахстан, Украина, Молдова. Освоить западный рынок белорусским фармацевтам пока не удается. Специалисты сетуют на высокую стоимость регистрации нового препарата в странах Европейского Союза. Она составляет 400 тысяч евро. Однако белорусский противоопухолевый препарат "Фотолон" одна немецкая компания взялась продвигать на западный рынок за свои средства, потому что препарат действительно уникальный. Но пока из 500 зарегистрированных в Беларуси отечественных медицинских препаратов он едва ли не единственный, которым заинтересовался западный покупатель.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ТРЭБА ВЕДАЦЬ

Витаміны: плюсы і мінусы

У 1912 годзе польскі вучоны Казімір Функ адкрыў новае рэчыва і назваў яго "вітамін", што ў перакладзе з лацінскай значыць "жыццёвы амін". З тае пары вучоныя ва ўсім свеце дыскутуюць аб іх карысці для здароўя.

Усім вядома, што вітаміны ўмацоўваюць імунітэт і запавольваюць працэсы старэння. Але ў вітамінаў ёсць свой цёмны бок. У некаторых выпадках лішак вітамінаў можа прынесці больш непрыемнасцяў, чым іх недахоп.

Вітамін D

Плюсы. Надае касцям трываласць, садзейнічае правільнаму фарміраванню шкілета, патрэбны ў якасці прафілактычнага сродку пры рахіце ў дзяцей і астэапарозе ў жанчын.

Мінусы. Мае ўласцівасць назапашвацца ў арганізме. Прыём яго ў дозе больш за 50 мкг можа прывесці да ліхаманкі, боляў у суставах, слабасці, парушэння сардэчнай дзейнасці і ўтварэння камянёў у нырках. А калі прымаць вялікія дозы працяглы час, то адбываецца дэмінералізацыя касцей (вымыванне кальцыя) і як следства — частыя пераломы.

Вітамін С

Плюсы. Спрыяльна ўздзейнічае на імунную сістэму арганізма, паляпшае тонус капіляраў, садзейнічае загойванню ран, зніжае ўтрыманне "дрэннага" халестэрыну ў крыві (сутачная патрэба чалавечага арганізма складае 75 мг).

Мінусы. Пры штодзённым прыёме ў колькасці больш за 1 грам можа выклікаць панос і галаўны боль. Калі вашы аналізы гавораць пра мочакіслы дыятэз (наяўнасць аксалатаў і ўратаў), то вітамін С можа спрыяць утварэнню камянёў у нырках.

Бета-каратін (правітамін А)

Плюсы. Спрыяльна ўплывае на стан скуры, слізістых абалонак і вастрыню зроку. Ён лічыцца адным з самых важных элементаў у абароне арганізма ад раку, таму што нейтралізуе свабодныя радыкалы (агрэсіўныя малекулы, якія псуюць клеткі). Спрыяе нармальнай імплантацыі (прымацаванню да сценкі маткі) аплодненай яйкаклеткі.

Мінусы. Перадазіроўка вітаміна А вядома пад назвай "каратінавая жаўтуха", калі колер скуры гарачага прыхільніка морквы ці ялавічнай пячонкі раптам робіцца яркааранжавым. У працэсе эксперыменту групе жанчын-курыльшчыц для зніжэння рызыкі ўзнікнення раку давалі бета-каратіну ў 20 раз больш за сутачную дозу. Высветлілася, что частата ўзнікнення гэтай хваробы ў вопытнай групе на 16% перавысіла аналагічную ў кантрольнай.

Вітаміны групы В

Плюсы. Удзельнічаюць у рэгуляцыі акісляльна-аднаўленчых працэсаў, абмене рэчываў, тлушчаў, вугляводаў, забеспячэнні арганізма энергіяй, неабходныя для нармальнага эрытрапаэзу (працэсу ўтварэння эрытрацытаў), функцыянавання нервовай сістэмы і дзейнасці галаўнога мозга, страўнікава-кішачнага тракту, рэгулююць працэсы клетачнага дзялення і згусальнасці крыві, садзейнічаюць паляпшэнню сну. У вялікіх дозах змяняюць пах цела. Дарэчы, навуковы факт, што такі пах вельмі не любяць камары.

Мінусы. Пабочным эфектам высокіх доз можа стаць парушэнне абмену рэчываў у арганізме. Перадазіроўка вітамінаў групы В праяўляецца агульным узбуджэннем, галаўным болем, галавакружэннем, бяссонніцай.

Прымаць ці не?

Канечне, бываюць выпадкі, калі доза вітамінаў, якая перавышае звычайную ў некалькі разоў, неабходна для папраўкі. Напрыклад, фоліевая кіслата (утрымліваецца ў піўных дражджах, пячонцы, арэхах, зялёнай салаце), якая вельмі важная для правільнай работы органаў і тканак, рэгулюе абмен рэчываў, павышае верагоднасць зачацця, паляпшае працяканне цяжарнасці. Таму маладым жанчынам (асабліва тым, хто ў бліжэйшай будучыні збіраецца стаць маці) дадатковы прыём фоліевай кіслаты проста неабходны.

У любым выпадку, перш чым набыць у аптэцы вітаміны, трэба папярэдне параіцца з урачом. Ён дапаможа выбраць з вялікай колькасці вітамінных і мінеральных дабавак патрэбны прэпарат. Гэта дазволіць вам пазбегнуць непрыемнасцяў і захаваць здароўе.

Абавязкова трэба прымаць вітаміны тым, хто:

— карыстаецца супрацьзачатачнымі таблеткамі;
— цяжарны ці корміць грудзьмі;
— курыць;
— любіць перакусіць на хаду ці харчуецца нерэгулярна;
— часта трапляе ў стрэсавыя сітуацыі;
— займаецца спортам;
— часта хварэе на грып, ВРВЗ, у каго на вуснах рэгулярна з'яўляецца герпес.

Аляксандра ЛАБЗОВА.

ВОПРОС—ОТВЕТ

Добрый день! С большим интересом прочитал в "Народной воле" за 16 марта статью про артериальную гипертензию. Сразу видно, что доктор Бельская переживает за своих пациентов и хочет им помочь. Подскажите, а как все-таки правильно измерять давление. А то у каждого свое мнение.

Владимир Андриенко, житель Минска.

Как правильно измерить давление

На вопрос нашего читателя отвечает кандидат медицинских наук, ассистент 2-й кафедры внутренних болезней БГМУ Елена Севировна БЕЛЬСКАЯ:

— Измерение производится в тихой обстановке, после 5-минутного отдыха. Перед этим рекомендуется хотя бы полчаса не курить, не пить кофе, чай. Первое измерение проводится на обеих руках, и если результаты отличаются более чем на 10 мм рт.ст., то в дальнейшем измерять АД нужно на той руке, на которой показания были выше. (То, что давление нужно обязательно измерять на левой руке ("к сердцу ближе") — ошибочный стереотип.)

АД измеряют в положении сидя, рука должна находиться на уровне сердца. Манжетка накладывается на нижнюю треть предплечья так, чтобы нижний край был на 2—2,5 см выше локтевой ямки. Манжетка должна накладываться не очень плотно и не приносить дискомфорта, иначе нарушается венозный отток и показания будут неверными. Руку нужно освободить от одежды, либо рукав должен быть из тонкой ткани. Стетоскоп не надо засовывать под манжетку. Сначала нужно на локтевом сгибе прощупать пульсацию артерии и через стетоскоп услышать биение пульса. *("Не удивляйтесь и не возмущайтесь, если врачи этого не делают. Они владеют визуальными способами определения, им помогает опыт",* — говорит Елена Севировна Бельская.)

Воздух в манжетке накачивается быстро (2—4 сжатия груши в секунду) до исчезновения пульсации в стетоскопе и на 20—30 мм рт.ст. выше последнего удара. Затем воздух медленно стравливают (2—3 мм в секунду). При этом необходимо внимательно слушать в стетоскоп пульс. Первый удар — это показатель систолического ("верхнего") давления. По последнему тону устанавливается диастолическое ("нижнее") давление.

Рекомендуется измерять АД три раза с интервалом в 2 минуты. Среднее значение проведенных измерений наиболее точно отражает уровень давления.

Александра ЛОБЗОВА.

Подростки становятся опасными

Весна — время небезопасное для "взрослых" детей, которых мы называем подростками, предупреждает портал "Здравоохранение и медицинская наука Беларуси".

Медики напоминают, что в психиатрии есть даже термин, характеризующий повышение активности подростков в это время года, — spring break, что можно перевести как "весенний надлом, уход от приличий". Именно весной молодые люди особенно часто устраивают различные увеселительные мероприятия с обильным потреблением алкоголя и не только. Весной, считают медики, активизируется сексуальная жизнь, у подростков в том числе. Они пытаются ее разнообразить, и как следствие этих "утех" испытывают физическое и нередко психическое истощение. Кроме того, повышается риск заражения заболеваниями, передающимися половым путем у подростков, боле чем у кого-либо другого.

Социологические исследования в Минске свидетельствуют о снижении среднего возраста первого полового контакта, повышение сексуальной активности, увеличение количества половых партнеров среди детей 15—17 лет.

Для того, чтобы как-то смягчить проблемы взросления, создаются Центры дружественного отношения к подросткам. В Минске такие организации действуют на базе нескольких поликлиник.

Психологи предупреждают родителей подростков: будьте внимательны к своим детям всегда и помогите пережить весну.

ПРАБЛЕМА

Хваля самагубстваў

...Ліцэй Белдзяржуніверсітэта чыноўнікі Мінадукацыі вызначаюць як элітарную навучальную ўстанову. Паміж прэтэндэнтамі на навучанне ў ім існуе жорсткая канкурэнцыя. Бацькі ў правінцыі плацяць шалёныя грошы рэпетытарам, каб вышкаліць дзіця для вучобы ў сталіцы. Недарма ходзяць чуткі, нібыта ліцэісты ўтварылі ў інтэрнаце па вуліцы Першамайскай свой "бамонд". Але бурляць тут і іншыя жарсці. Пацвярджэнне — нядаўні суіцыд 17-гадовай ліцэісткі. Цяпер псіхолагі працуюць з сяброўкамі нябожчыцы.

Суіцыд — гэта спроба прыцягнуць увагу

Што кажуць спецыялісты пра намеры тых, хто наўмысна пакідае жыццё? Вось меркаванне доктара **Ігара САЎКІНА** — псіхіятра са шматгадовым стажам, які працуе ў Мінскім гарадскім псіханеўралагічным дыспансеры.

— Па вялікім рахунку любы суіцыд — гэта спроба прыцягнуць да сябе ўвагу, — кажа ўрач. І за адным дарэннем можа пацягнуцца шлейф іншых. Я памятаю, калі сёння адна пацыентка выкінулася ў акно, а літаральна праз два дні паляцела і другая. Цяжкай дэпрэсіі ў іх не было, дзяўчаты ляжалі ў адным аддзяленні.

Са слоў Ігара Саўкіна, у Беларусі цяпер суіцыды найчасцей адбываюцца з прычыны безвыходнасці. У якасці прыкладу медык называе вёскі Талачынскага раёну. У мінулым годзе і сёлета тут адбылося больш як 20 самагубстваў. У асноўным з прычыны беспрацоўя і п'янства. Часцей пачалі накладваць на сябе рукі і непаўналетнія.

Вось што паведаміў тамтэйшы жыхар Мікалай Петрушэнка пра прычыну нядаўняй смерці 14-гадовага падлетка Анатоля:

— Калі ён вучыўся ў восьмым класе, яго равеснікі паехалі ў Мінск, у "Макдональдс". А ён, усё лета адпрацаваўшы пастушком, грошай не атрымаў. Маці таксама. Карацей, яму не было за што выправіцца нават не ў самую далёкую дарогу. Вельмі перажываў з-за таго... Калі сябры расказалі, як яны пагулялі ў сталіцы, адразу пайшоў да яблыні і накінуў на сябе пятлю.

Сумнае лідэрства Віцебшчыны

На Віцебшчыне — найбольшая колькасць суіцыдаў за апошнія дзесяць гадоў. Па нарматывах Усясветнай арганізацыі аховы здароўя, 30 выпадкаў самагубстваў на 100 тысяч насельніцтва лічыцца высокім узроўнем. На Віцебшчыне гэты паказчык вагаецца ў межах 42—50 выпадкаў. Рэгіён ужо апярэдзіў Латвію, Літву, Эстонію, Расію і Венгрыю — краіны, якія займаюць першыя месцы па колькасці самагубстваў у свеце. Іх сярэдні ўзровень у такіх краінах, як Аўстралія і ЗША, — ад 10 да 20 чалавек на 100 тысяч насельніцтва, а зусім нізкі — у Грэцыі, Італіі і Арменіі.

Па даных Віцебскага абласнога ўпраўлення статыстыкі, рост колькасці суіцыдаў пачынаецца ад 17, 20 і 25-гадовай адзнак і дасягае свайго піку ў 45—60-гадовым узроставым прамежку.

Увогуле, у Беларусі ад самагубстваў гіне людзей больш, чым у дарожна-транспартных здарэннях. Пра гэта заяўляе галоўны псіхіятр краіны **Павел РЫНКОЎ.** У 2000 годзе было зафіксавана 3395 самагубстваў, у 2004 — 3297. У 2005-м і 2006 гадах — амаль па чатыры тысячы.

Псіхіятры пераконваюць, што спроб самагубства ў 10—15 разоў болей за здзейсненыя. А людзей, якія рэгулярна думаюць пра гэты спосаб вырашэння праблем, яшчэ больш. Кожны самагубца пакідае пасля сябе ў сярэднім 8 родных і блізкіх людзей, якія атрымліваюць душэўную траўму і засвойваюць мадэль суіцыдальных паводзін.

Што рабіць, каб папярэдзіць «апошні імпульс»?

Падлеткавы ўзрост урачы называюць адным з фактараў, якія падштурхоўваюць да трагічнага ўчынку. Прыкметы крызісу — схільнасць да абасобленасці, абыякавасць да ранейшых улюбёных заняткаў. У самы крытычны момант падлеткі пачынаюць раздаваць свае рэчы... Так што будзьце ўважлівымі да сваіх дзяцей, і калі што — звяртайцеся да спецыялістаў.

Галіна БАРАВАЯ,
www.bulletinonline.org

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 САКАВІКА 2007 г.

СПЕЦИАЛЬНЫЙ РЕПОРТАЖ

Курт Фрэйзер пока определился только с составом в семье

Корреспондент «Народной воли» навестил семью американского тренера сборной Беларуси по хоккею Курта Фрэйзера

Понедельник. Минская гостиница “Планета”. Полвосьмого вечера. Именно на это время мы договариваемся встретиться с Куртом Фрэйзером, который намедни прилетел в Минск из США вместе со своей семьей: женой Рондой и тремя сыновьями — 14-летним Кейси, 12-летним Джесси и 11-летним Луком.

— Вчера были в цирке, сегодня весь день катались за городом на квадрациклах и играли в пейнтбол, — рассказывает Курт. — Перепачкались, конечно, но дети были такими довольными! Правда, ждут не дождутся, когда я их отведу на хоккей.

— Сыновья пошли в отца?

— Да, все трое занимаются хоккеем и очень хотят посмотреть в Минске игры детей своего возраста. Когда собирались ехать сюда, все трое пытались запихнуть в сумки свои форму и коньки. Мне несколько раз приходилось “потрошить” их рюкзаки.

— Три сына — это окончательный состав или будете укрепляться?

— О, я понимаю ваш юмор и понимаю, что трое детей в семье — это, наверное, много, — смеется Курт. — Так что будем считать, что с составом мы уже определились.

Курт Фрэйзер возглавил сборную Беларуси около года назад после того, как ее покинул предыдущий канадский наставник Глен Хэнлон. В свое время Курт Фрэйзер играл в Национальной хоккейной лиге в клубах “Ванкувер Кэнакс”, “Чикаго Блэкхокс” и “Миннесоте Норт Старз”, тренировал “Атланту”, работал ассистентом тренера в “Айлендрсе” и “Сент-Луисе”.

“Как-то Глен Хэнлон сказал, что над переездом в Беларусь он думал ровно пять секунд, — рассказывает мой собеседник. — *Я раздумывал над предложением о том, чтобы возглавить белорусскую сборную еще меньше. Глен рассказал мне о Минске и о работе в сборной много хороших вещей. Он говорил о том, какое наслаждение работать с командой, какие здесь прекрасные игроки, как заботится о тренере Федерация”.*

— Но говорят, что Вы боялись, что в Минске Вас будут заставлять пить водку?

— На самом деле я не большой любитель выпить. Поэтому, когда у меня спрашивают “Буду ли пить?”, я отвечаю: “Не хотелось бы”. Хотя за время пребывания в Беларуси



уже успел дважды попробовать водку и скажу вам: “Не так черт страшен!” А вообще, я бы с огромным удовольствием еще раз поднял рюмочку за победу сборной Беларуси.

Во время первой встречи американского тренера с журналистами руководитель Федерации хоккея Владимир Наумов огласил сумму контракта Курта Фрэйзера — 100 тысяч долларов в год. Не маловато ли для тренера такого уровня? Тренер скромно отвечает, что приехал сюда не ради денег: *“Это для меня замечательная возможность получить новый опыт и знания и изучить игроков. В НХЛ ведь немного другой хоккей, поэтому очень интересно поработать с ”вашим".*

Курт признается, что в самом начале работы чувствовал некоторый дискомфорт в языковом плане. Со временем привык, тем более что в команде есть игроки, которые знают английский да к тому же в качестве переводчиков могут выступать ассистенты Эдуард Занковец и Владимир Цыплаков. А вот самостоятельное изучение русского языка плодов пока не принесло. Месяц учебы в Минске полностью перечеркивается очередной поездкой в США, после которой Курт Фрэйзер обычно забывает все, что учил раньше.

— Господин Фрэйзер, чего ожидать болельщикам от белорусской сборной на предстоящем чемпионате мира в Москве?

— Мы можем выступить не хуже, а, возможно, даже и лучше, чем в прошлом году. Но это во многом зависит от состояния здоровья игроков и от того, сможем ли мы привлечь игроков, которые играют в Америке. В России, допустим, Мезин, Костюченок и Денисов много просидели на скамейке запасных из-за травм, так что по ним ничего неизвестно. Не исключаю появление в составе Алексея Калюжного. Еще более туманная ситуация с “легионерами”, которые выступают за океаном. Например, мала вероятность того, что помогут сборной Андрей Костицин и Михаил Грабовский, которые играют в плей-офф в своих клубах, ничего неизвестно и по приезде Руслана Салея — его жена сейчас ожидает второго ребенка.

...В это время к нам присоединяются супруга и сыновья Курта Фрэйзера. Они пробыли в Минске всего два дня, но впечатлений — море. Скоро весенние каникулы закончатся, 23 апреля они уедут из нового “дома” своего отца — минской гостиницы “Планета”.

— Кухня у вас просто замечательная! — не скрывает восхищения Ронда.

— И развлечения — тоже! — добавляют дети.

— Это точно, — с легкой грустью резюмирует Курт. — После такого отдыха в Минске сыновьям неделю надо будет восстанавливаться в Штатах.

Алесь СИВЫЙ.
Фото автора.

P.S. *Автор благодарит генерального менеджера Федерации хоккея Беларуси Святослава Киселева и пресс-секретаря Констанцию Лещенко за помощь в подготовке материала.*

ПОГОДА

Самая теплая за всю историю наблюдений

Прошедшая зима оказалась самой теплой с момента начала метеонаблюдений в 1880 году, передают информагентства со ссылкой на Национальное управление океанических и атмосферных исследований США.

По данным экспертов, в период с декабря по февраль температура была выше средней во всей Европе, в Азии, на юго-востоке Бразилии и в северо-восточных районах США. Холоднее, чем обычно, было только в Саудовской Аравии и в центральной части США.

Американские эксперты отмечают, что до 1976 года среднее увеличение температуры в мире за каждые 12 лет составляло 0,06 градуса по Цельсию, однако после 1976 года этот показатель увеличился в три раза — до 0,18 градуса.

В последнее время ведущие ученые и политики мира неоднократно высказывали опасения относительно глобальных изменений климата планеты. Так, британские синоптики предположили, что 2007 год может оказаться самым теплым для нашей планеты: среднегодовая температура ожидается на 0,54 градуса выше многолетнего показателя, который составляет 14 градусов по Цельсию. В начале февраля нынешнего года ведущие ученые из 113 стран мира представили отчет, согласно которому глобальное изменение климата с “наибольшей вероятностью” вызвано человеческим фактором.

РЭЙТЫНГ

Самыя багатыя людзі планеты

Амерыканскі часопіс “Forbes” апублікаваў штогадовы рэйтынг найбагацейшых людзей свету. Першае месца ўжо 13 гадоў запар трымае Біл Гейтс — заснавальнік імперыі “Microsoft”.

Сёлета ў спісе апынулася рэкордная лічба мільярдэраў — 946. Рэйтынг дапоўнілі 19 расіян, 14 індусаў і 13 кітайцаў. Упершыню туды трапілі жыхар Кіпра, румын, серб, а таксама мільярдэр з Амана.

Што агульнага ва ўсіх багацеяў? Вынаходлівасць. Грошы яны робяць, уласна кажучы, на ўсім. Пачынаючы з медыяў, нерухомасці, кавы і заканчваючы ежай і этылавым спіртам.

Ул.інф.

СІТУАЦЫЯ

Другое «прышэсце варагаў» у Полацк

Ці патрэбна дапамога расійскіх рэстаўратараў у аднаўленні насценнага жывапісу Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы?

У Савецкім Саюзе ідэалогія стаяла над эканомікай, вызначала палітыку, ігнаравала рэчаіснасць, супярэчыла здаровому сэнсу. На вайне людзі тысячамі гінулі ў непадрыхтаваных, бессэнсоўных з ваеннага пункту погляду атаках, каб узяць той ці іншы населены пункт да дня нараджэння таварыша Сталіна. У мірны час будаўнікі нярэдка ішлі на парушэнні тэхналогіі (недаробкі выяўляліся пры эксплуатацыі), каб здаць прамысловы аб’ект ці квадратныя метры жылля да чарговага з’езда КПСС ці гадавіны Кастрычніка. На жаль, і ў суверэннай Беларусі шмат чаго робіцца на савецкі ўзор, паводле рускай формулы “Наше дело прокукарекать, а там — хоть солнце не вставай”.

На пачатку года афіцыйныя СМІ парадавалі грамаду паведамленнем, што рэстаўрацыя полацкай Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы, што доўжыцца ўжо пятнаццаць год, блізкая да завяршэння. Ужо 5 чэрвеня бягучага года, на Дзень Святой Еўфрасінні Полацкай (і дзень наведвання Полацка прэзідэнтам), храм мусіць прадстаць перад вернікамі і атэістамі, палачанамі і гасцямі горада “во всей красе”. Павеліччэнне інтэнсіўнасці працы будзе забяспечана дадатковымі грашыма з дзяржаўнага бюджэту, а з кадрамі рэстаўратараў дапаможа Расія. За тры месяцы (сакавік, красавік, май) сіламі расійскіх рэстаўратараў з Міжабласнога навукова-рэстаўрацыйнага мастацкага ўпраўлення пры Мінкульце Расійскай Федэрацыі плануецца завяршыць працу над фрэскамі храма. Расійскія будаўнікі заменяць дах, пакрыюць пазалотаю купал і крыж. Царкву ператынкуюць звонку. Інтэр’ер таксама зменіцца. Падлога стане мазаічнай. З’явіцца агароджаная пляцоўка для агляду. Мошчы Святой Еўфрасінні змесцяць у срэбраную раку. Пасля чаго можна будзе рабіць заяўку на ўключэнне Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Хтосьці, пачуўшы гэта, можа, шчыра парадаваўся, а вось спецыялісты і людзі дасведчаныя занепакоіліся. Агульная плошча насценнага жывапісу храма — амаль 600 квадратных метраў. Гэта фрэскі XII стагоддзя з наслаеннямі пазнейшых размалёвак. Самы верхні слой — алейны жывапіс XIX стагоддзя. Можна папросту саскрэбці ўсё “лішняе” і такім чынам раскрыць для гледачоў каштоўныя фрэскі. Але справа ў тым, што гэта “лішняе” зусім не лішняе, яно мае пэўную эстэтычную і гістарычную каштоўнасць. Беларускі рэстаўратар Уладзімір Ракіцкі на працягу пятнаццаці год раскрыў недзе 150 квадратных метраў фрэсак XII стагоддзя (чацвёртую частку ад агульнай плошчы жывапісу), пры гэтым максімальна захаваўшы знятыя наслаенні. Алейны жывапіс асцярожна зняты, перанесены на палатно і экспануецца ў музеі. Праца руплівая, марудная.

Няўжо расійскім рэстаўратарам, калі яны пойдуць шляхам Уладзіміра Ракіцкага, хопіць трох месяцаў, каб раскрыць астатнія 450 квадратных метраў фрэсак? Не хопіць. Але яны ў дадзеным выпадку і не збіраюцца скарыстоўваць беларускі досвед. Іхняя мэта — замацаваць раскрытыя фрэскі і адрэстаўраваць размалёўкі XIX стагоддзя. Паўстае пытанне: навошта рэстаўраваць тое, што з часам усё адно будзе са сцяны знята і перанесена на іншую аснову. Што датычыць умацавання фрэсак XII стагоддзя, дык Ракіцкі і ягоныя памочнікі, якія навобмацак ведаюць кожны сантыметр храмавых сцен, безумоўна, зробяць гэта лепей за расійскіх гастралёраў. Дарэчы, адносна кваліфікацыі расійцаў гавораць рознае.

Ніхто не бярэ пад сумнеў прафесіяналізм начальніка зганданай вышэй рэстаўрацыйнай установы пры Мінкульце РФ Сяргея Філатава. Ён працаваў (як кажуць, плённа) у храмах Суздаля, Ноўгарада, Македоніі. Але малаверагодна, што сам начальнік будзе па нашых сценах поўзаць. А пра ягоных падначаленых, што прыедуць у Полацк, дакладных звестак пакуль няма. Але ўжо адно тое, што яны пагадзіліся ўдзельнічаць у такой сумніўнай справе, як “экспрэс-рамонт” полацкай Спаса-Еўфрасіннеўскай царквы без навуковай і архітэктурнай экспертызы, без уліку праекта рэстаўрацыі, распрацаванага і часткова здзейсненага Уладзімірам Ракіцкім і ягонымі калегамі, сведчыць, што хлопцы не шануюць прафесійную этыку.

Наўрад ці можна лічыць нармальным тое, што пасля “прызвання варагаў” (чытай, расійцаў) ад працы адхілены Уладзімір Ракіцкі. Афіцыйная падстава — ягоная заява з фармулёўкай “па ўласным жаданні”. Але тыя, хто ведае Ракіцкага, упэўнены, што на нязменнага кіраўніка праекта рэстаўрацыі, які паспяхова рэалізоўваўся на працягу пятнаццаці гадоў, лаўрэата прэзідэнцкай прэміі “За духоўнае адраджэнне” ўчынілі ціск. Інакш кажучы, не сам пайшоў, а яго “пайшлі”. Зараз Уладзімір Ракіцкі беспрацоўны. Каменціраваць сітуацыю ён адмаўляецца. Але ў гэтым і патрэбы няма.

Савецкая завядзёнка, пра якую ішла гаворка ў першых радках публікацыі, доўжыцца ў асобна ўзятай суверэннай Рэспубліцы Беларусь.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Не спазніцеся!

Да 1 красавіка — усяго 9 дзён. Хто не зрабіў **перадаплату** за нумары II квартала — не спазніцеся.

Паўтараем просьбу: агітуйце за “Народную волю” блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б “Народную волю”, але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом “Народнай волі”, паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял “Беларусбанка”, а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за тры месяцы адпаведна 28.500 і 45.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты “Народнай волі” такія:

УП “Народная воля”: р/р 3012006535014, ААТ “Пріорбанк”, ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за март,				
апрель, май, июнь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за март,				
апрель, май, июнь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Прыплылі!

Суткі знаходзіліся пад арыштам украінскіх памежнікаў спартсмены беларускай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ, якія па вадзе перасеклі дзяржаўную мяжу.

Зараз зборная па веславанні на байдарках і каноэ знаходзіцца на трэніровачных зборах у Днястроўску (Прыднястроўе), дзе, уласна кажучы, усё і адбылося.

Ранкам 19 сакавіка ўкраінскія памежнікі зафіксавалі парушэнне мяжы ў раёне Карчуганскага лімана, праз нейкі час былі затрыманы і 11 парушальнікаў, якія аказаліся... беларускімі спартсменамі. Апошніх даставілі на заставу, дзе яны пачалі чакаць суда.

“Калі падняўся моцны вецер, нас проста знесла ў бок ад пазначанага маршрута, — патлумачыў скандальную гісторыю старшы трэнер зборнай Беларусі па рэзерве **Сяргей Карняевец**. — *Атрымалася, што перасеклі мяжу, хоць на вадзе і не зразумееш, дзе тая мяжа — ніякіх жа пазнавальных знакаў не было. Нас затрымалі, праз нейкі час з Днястроўска прывезлі нашы пашпарты, а 20 сакавіка адбыўся суд”.*

Па рашэнні суда спартсмены абмежаваліся адміністрацыйным пакараннем, якім прызнана сутачнае знаходжанне на заставе. Пасля гэтага беларусы былі адпушчаны ў трэніровачны лагер. Маўляў: плывіце з Богам!

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Посчитали зубров

Два месяца понадобилось егерской службе Национального парка “Беловежская пуща”, чтобы посчитать обитающих в реликтовом лесу зубров. За минувший год стадо уникальных животных пополнилось 46 зубрятами, которые благополучно пережили минувшую зиму. Сейчас на белорусской территории пущи обитают 334 зубра, 400 особей живут на ее польской стороне.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб’явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА “Типография Михайлова - С”, 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА “Типография Михайлова”, 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 21.03.2007 у 16.00. Аб’ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №